Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Рукапісы, якія не прыдуцца, назад аддаваць не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: Інвагародзіх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапарэлі пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок шапарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. даражэй. Зоны тарыфу бяруцца 10 проц. налогу

ПАДПІСКА ПРЫМАЮЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўных і чырвонармейцаў за дакумэнт — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 187 (2375) Серада, 15-га жніўня 1928 г.

Ушанаваньне экіпажу „Красіна" нарвэскімі рабочымі.

ОСЛО, 14-8. Рабочыя арганізацыі Ставангера наладзілі ў панядзелак увечары абед у чэсьць каманды лёдаколу «Красін». На ўзьбярэжжы каманду сустрэлі прадстаўнікі гэтых арганізацый са штандарамі і чырвонымі сьцягамі. Пасьля спатканьні былі кароткія прамовы. Потым усе накіраваліся да дому профсаюзаў. Па дарозе каманду «Красіна» прывіталі вялічэзныя масы жыхарства, якія вышліся на вуліцах.

Пасьля абеду з прамовамі выступалі прадстаўнікі нарвэскае кампартыі, а таксама супрацоўнік «Юманіте». Вялізная заля дому прафсаюзаў, у якім адбываліся, была набіта бітком.

Прадстаўнік нарвэскае кампартыі, рэйшы камуністычны дэпутат Эгед Ін сказаў: «Усе, хто клікаў на дапогу сабе, ня былі прыяцелямі СССР; яны былі фашыстамі і бадай нашымі самымі найзлоснымі ворагамі. Аднак, незважаючы на гэта, СССР зараз-жа ладзіў экспэдыцыю. Для тых нарвэжцаў, якія, мабыць, думалі, што толькі мы нарвэгцы, здольны з посьпехам працаваць у канцавосных абласьцёх, бо-б карысна бачыць, як удала праводзіцца работа савецкія экспэдыцыі. Рэвалюцыйная кляса ганарыцца вамі.

Тое, што вы зрабілі, зьяўляецца найвялікшаю працаю на карысьць спакою, якая выканана дасюль з часоў усясьветнае вайны. Вы садзейнічалі аслабленьню антысавецкага фронту, які зараз зьяўляецца, мабыць, больш моцным, чым калі-небудзь з часоў першых цяжкіх гадоў, перажытых вамі пасьля вайны. Няхай жыве каманда «Красіна». Няхай жыве СССР».

Прамова Нісэна была спаткана гучнымі воплескамі.

Пасьля нарвэгца выступіў французкі журналіст, супрацоўнік «Юманіте», Марыс Донсэль, які казаў ад імя французкае кампартыі. Перадаўшы камандзе «Красіна» горачыя прывітаньні французкае работніцкае клясы, прамоўца выказаў надзею, што «Красін» выратуе Амундсэна і Гільбо.

Пасьля гэтых прамоў камандзе „Красіна" была паднесена срэбная ваза з ружамі.

У адказ ад імя каманды «Красіна» выступіў з прамовай камісар Арас, які сказаў: «Шчырае спатканьне нас работніцкай клясай Ставангера паказаў, што наш лёзунг: «Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся» зьяўляецца найлепшым лёзунгам ва ўсім сьвеце».

Імпэрыялісцкая сутнасьць калёніяльнае палітыкі II Інтэрнацыяналу.

Дэкларацыя прадстаўнікоў калёній на брусэльскім кангрэсе.

БЭРЛІН, 13-8. Паводле вестак з Брусэлю, прысутныя на кангрэсе 2-га Інтэрнацыяналу ў ліку гасьцей прадстаўнікі калёніяльных краёў вельмі абураны рэзалюцыяй кангрэсу аб калёніяльным пытаньні.

Чаман-Лал (Індыя) пакінуў кангрэс яшчэ перад ухвалаю рэзалюцыі.

Прадстаўнікі студэнцкага саюзу Інданэзіі, саюзу кітайскіх рабочых у Францыі, саюзу кітайскіх студэнтаў у Эўропе і паночнае афрыканскае рабочае арганізацыі агаласілі дэкларацыю, у ёй адзначана, што 2-гі Інтэрнацыянал назначыў спэцыяльную камісію, каб выслухаць прадстаўнікоў контр-рэвалюцыйнага Гаміндану, адказнага за забойствы дзесяткаў тысяч рабочых і сялян у Кітаі, а пралетарскім і нацыянальна-рэвалюцыйным арганізацыям калёніяльных краёў не далі на кангрэсе магчымасьці абмаляваць сапраўднае становішча ў калёніях. Мэмарандум аб калёніяльным пытаньні,—гаворыцца ў дэкларацыі—складзен прадстаўнікамі эўрапэйскіх сац.-дэмакратычных партый, якія даказалі, што іхняя калёніяльная палітыка зьяўляецца імпэрыялістычнаю.

Сацыял-здраднікі дагаварваюцца

Намесьнік Генэральнага Сэкрэтара Інтэрнацыяналу сальсавец Фрыц Геккерт у гутарцы з гатшкім маскоўскім карэспандэнтам аб адчыненым у Брусэлі Кангрэсе Другога Інтэрнацыяналу сказаў: «На кангрэсе сацыял-здраднікаў стаялі тры важныя пытаньні:

1) Пытаньне аб мілітарызьме і вайне небясьпецы, 2) калёніяльнае пытаньне і 3) пытаньне аб узаемадносінах з Амстэрдамскім Інтэрнацыяналам.

Па гэтым кангрэсе рэфармісты ўсіх краін будуць апраўдваць сваю палітыку супрацоўніцтва в буржуазеяй, дазячы немагчымасьць ажыцьцяўленьня сацыялізму рэвалюцыйным шляхам супроцьставячы гэтаму павольнае зьнічэньне супярэчнасьцяй капіталістычнага сьвету ў рамках дэмакратыі, шляхам захаваньня нацыянальных гаспадарак ад вайны і эканомічных узрушэньняў.

Здзельнікі гэтага кангрэсу вельмі моцна зьвязаны з пануючай клясай сваіх нацый, каб зразумець сапраўдную небясьпеку вайны, створаную іх імпэрыялістычнымі ўрадамі. Яны будуць даводзіць, што ваенная небясьпека пагражае ня з боку імпэрыялістаў, а з боку СССР, спрабуючы, такім чынам апраўдаць мілітарызм сваёй «бдыкаўшчыны».

Пост нацыянальна - рэвалюцыйнага руху ў калёніяльных і поўкалёніяльных краінах прымусіў II-гі Інтэрнацыянал зьвярнуць, нарэшце, сваю ўвагу і на калёніяльнае пытаньне. Аднак, выпрацаваная ангельскімі рэфармістамі калёніяльная праграма ўсё яшчэ не прызнае за прыгнечанымі народамі права на самавызваленьне, лічачы, што яны знаходзяцца на ніякай ступені разьвіцьця і ня змогуць кіраваць сваёй краінай. Наўрад ці такая праграма будзе мець посьпех у калёніяльных народаў. Кіраўнікі II-га Інтэрнацыяналу нават не паклапаціліся аб тым, каб запрасіць на кангрэс дэлегатэў нацыянальна - рэвалюцыйнай партыі. Аднак яны запрасілі да сябе гаміндановскіх генэралаў, патапіўшых у крыві кітайскую рэвалюцыю. У той момант, калі кітайская рэвалюцыя яшчэ толькі пачыналася, II-гі Інтэрнацыянал таксама як і Амстэрдамскі адмовіў ёй у сваім падтрыманьні. Зараз, калі гаміданаўскія генэралы пры дапамозе імпэрыялістаў загубілі 240 тысяч рэвалюцыйных рабочых і сялян, II-гі Інтэрнацыянал лічыць іх сваімі прыяцелямі і саюзьнікамі.

Бясспрэчна, кангрэс пастараецца таксама ўзмацніць сваю сувязь з Амстэрдамскім Інтэрнацыяналам, каб разам з падвоенай сілай праводзіць сваё супрацоўніцтва з капіталам і змагацца супроць рэвалюцыйных элементаў, супроць Камінтэрну, Прафінтэрну і СССР.

Пленум выканкому Гаміндану.

ШАНХАЙ, 13-8. На пасяджэньні пленуму выканкому Гаміндану ўхвалена заклікаць народу поўную волю арганізавацца ў границах закону». Усе арганізацыі, якія пачнуць васпоўвацца, павінны знаходзіцца пад кіраўніцтвам Гаміндану і пад наглядам уряду.

Пленум далей пастанавіў перадаць Гаміньні прадстаўнікоў гаміндёўцаў урадавай радзе, каб яна абгаварыла і выдала цэўныя меры.

Далей пленум ухваліў зараз-жа распачаць распрацоўку праекту канстытуцыі Кітаю.

Фын-Юй-Сян не бярэ ўдзелу ў пасяджэньнях пленуму, хоць падаў прапазіцыі пленуму «палепшыць становішча мас».

СТАЧКА АПТЭКАРАЎ.

ШАНХАЙ, 13-8. Забаставала звыш 4-х тысяч служачых кітайскіх аптэчных магазынаў. Бастуючыя дамагаюцца павялічыць зарплату, узяць на службу нядаўна звольненых служачых і палепшыць абыходзіны з служачымі.

Мукдэнскі сатрап згодзень здрадзіць Нанкіну.

ТОКІО, 13-8. Японскі друк паведамляе, што Чжан-Сюэ-Лян ізноў схіляецца разарваць згоду з Нанкінам, з прычыны энергічнага пратэсту, які заўлен мукдэнскаму ўраду японскім генэральным консулам Хі ў Мукдэне.

Адна паведамленьня «Тоніо Асакі».

Планэўры ангельска-французскіх войск.

ЛЁНДАН, 14. Абгаварваючы праект ваеннага міністэрства аб супрацоўніцтве ангельскай конніцы з французкай арміяй ў Трырскай акрузе, Рэйнскай вобласьці, «Морнінг Пост» выказае нездаволеньне крытыкай, якою сустрэў гэту прапанову нямецкі друк. Згодна слоў «Морнінг Пост», агульныя ваенныя паміж ангельскай і французкай арміямі зьяўляюцца справай „натуральнай і пажаданай".

Лібэральная газэта «Дэйлі Н'юс» в гэтага поводу піша, што дрэннае становішча дзяржаўнага кіраваньня ў Англіі, праз позьняе ўлучэньне да пакту Келёга, раскрыла ангельска-французкі марскі кампраміс.

Лібэральная «Манчэстэр Гардыян» пытае, ці зьяўляецца ўдзел ангельскай конніцы ў французкіх манэўрах проста нетактоўнасьцю, ці яно мае якое-небудзь палітычнае значэньне.

На VI кангрэсе Камінтэрну.

Абгавор праэкту праграмы.

ТАВ. ЛАЗОЎСКІ кажа у праэкце праграмы—вельмі мала месца дадзена прафсаюзнаму пытаньню. У фармуліроўцы задач прафсаюзаў перад заваёваю ўлады ні слова ня сказана аб канчатковай мэце стачачнае барацьбы—аб скасаваньні буржуазнага дзяржаўнага апарату. Апрача таго, адсутнічае ленінская фармулёўка рэформ, як пабочных прадуктаў рэвалюцыйнае барацьбы, і няма правільнага вызначэньня сутнасьці рэакцыйных прафсаюзаў. У праэкце ня сказана выразна, што апарат рэфармісцкіх прафсаюзаў зьяўляецца па сутнасьці зьвяном буржуазнага дзяржаўнага апарату ўнутры рабочае клясы. Не асьветлена таксама і праблема ўзаемадачыненьняў між партыяй і прафсаюзамі. У праграме Камінтэрну трэба вызначыць ня толькі мінулае і сучаснае, але і будучае прафсаюзаў. Пры пралетарскай дыктатуры прафсаюзы зьяўляюцца найважнейшымі органамі сацыялістычнага будаўніцтва. Яны захоўваюцца, праўда, у зьмененай форме, і ў камуністычнай грамадзе, як органы разьмеркаваньня прадукцыі і вучоту.

Праэкт неабходна дапоўніць цэлым разьдзелам аб пытаньнях прафсаюзнага руху. У гэтым разьдзеле неабходна згуртаваць усё, што Камінтэрн хоча і павінен сказаць масам у праграме аб пытаньнях рэфармісцкага і рэвалюцыйнага прафсаюзнага руху.

ТАВ. СЭМАР (*Францыя*) гаворыць: праэкт праграмы выкарыстаў увесь той вопыт, які мы выбралі ў працягу дзесяці гадоў. У праэкце неабходна больш падрабязна асьвяціць здраднідства сацыял-дэмакратыі і яе паводзіны ў адносінах да СССР, а таксама яе ролю ў капіталістычнай рацыяналізацыі.

Французкая дэлегацыя лічыць мэтазгодным, каб у праграме больш поўна была вызначана магчымасьць пабудовы сацыялізму ў адным краі. Мы прапануем зрабіць, акрамя таго, яшчэ некалькі зьменаў і ў пунктах, якія датычаць тактыкі прафсаюзаў, і хацелі-б асабліва, каб у праграме была кароткая ахарактарызавана мэта тактыкі адзінага фронту. Нарэшце, мы лічым, што пытаньне аб нацыянальных меншасьцях павінна быць таксама закрануто.

ТАВ. АРНО (*Англія*) заўважае, што ангельская дэлегацыя ў агульным згодна з прапанаванымі праэктам праграмы і вітае яго, як працяг справы Маркса, Энгельса і Леніна. Ангельская дэлегацыя лічыць вусім правільным і неабходным, каб у праэкце праграмы быў выкарыстан увесь вопыт расейскае рэвалюцыі і катэгарычна адхіляе крытыку ўсіх таварышоў, якія называюць праэкт „расейскім".

ТАВ. ТАНКЕР (*Нямеччына*) гаворыць: тав. Бухарын пераканаў мяне адносна формы праэкту праграмы. Тым ня менш я прапаную, каб мы назвалі праграму—праграмай-маніфэстам з тым, каб з гэтае праграмы-маніфэсту вылучыць кораткую яго прынцыповы зьмест, які можна будзе зьмясьціць у партыйным білеце. Кангрэс павінен ухіліць праграму прынамсі ў яе асноўным зьмесьце. Калі Маркс у крытыцы Гоцкае праграмы сказаў, што кожны крок сапраўднага рэвалюцыйнага руху варт больш, чымся тузін праграм, дык мы павінны заявіць сёньня, што нашая праграма стала цяпер адным з найбольш важных крокаў практычнага руху.

ТАВ. МІКАЛОС (*УССР*) зазначае, што ў праэкце дадзена шмат фармулёвак аб дыктатуры пралетарыяту, але няма ленінскае фармулёўкі дыктатуры пралетарыяту, як асабліваё формы клясавага саюзу між пралетарыятам і шматлікімі непралетарскімі працоўнымі гушчамі, для поўнага зьнішчэньня капіталу і прыдушэньня адпору і рэстаўрацыйных спроб буржуазеі ў інтарэсах пабудовы сацыялізму. Некалькі фармулёвак у праэкце павінны быць распрацованы больш выразна. Напрыклад, пункт, які зазначае на абавязак пралетарыяту прыгнечваючае нацыі дапамагаць вызваленчаму руху прыгнечаных нацый аж да поўнага вызваленьня. Тав. Горас вымагаў тут уключыць у праэкт зазначэньне на неабходнасьць арганізаці максымальна буйных дзяржаў. У праэкце праграмы зьмяшчаецца патрабаваньне аб арганізацыі вялічэзнае дзяржавы—Саюзу Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік усяго сьвету. З другога боку неабходна падкрэсьліць, што самая маленькая Савецкая Рэспубліка лепш, чымся вялікая імпэрыялістычная дзяржава.

ТАВ. НАРАЯН (*Індыя*) вітае ад імя індыйскае дэлегацыі праэкт праграмы. Аднак з галоўных асаблівасьцяў праэкту,— гаворыць ён,—зьяўляецца тое, што ў ім падрабязна вызначана калёніяльная барацьба, як частка сусьветнае рэвалюцыі. Тым ня менш, мы выказваем пажаданьне, каб некаторыя пункты, якія датычаць калёній, асабліва Індыі, былі фармуляваны больш выразна. Што-ж датычыць фармулёўкі праэкту адносна магчымасьці часовага супрацоўніцтва в тубыльнай буржуазеяй у барацьбе проці імпэрыялізму, дык мы лічым неабходным падкрэсьліць, што індыйская буржуазея ня можа шчыра змагацца проці ангельскага імпэрыялізму. Індыйская камуністычная партыя можа і павінна выкарыстаць супярэчнасьці між індыйскай і ангельскай буржуазеяй, аднак, яна ня мае права забываць, што гэта ў сутнасьці толькі «вялмельны канфлікт» між дзьвюма буржуазеямі.

Пасьля прамовы т. Нараяна вячэрняе пасяджэньне зачыняецца.

* * *

14-га жніўня адбудуцца два плянарных пасяджэньні кангрэсу ў 9 гадзін раніцы і ў 5 гадзін увечары. У парадку дню—заключнае слова т. Бухарына па праграмным пытаньні і даклады т. т. Куусінена і Эрколі па калёніяльным пытаньні.

Сілы польскага фашызму далёкі ад адзінства.

Лягер пілсудчыкаў расколаты на асобныя канкурэнтныя зграі

БАЙКОТ ВІЛЕНСКІХ УРАЧЫСТАСЬЦЯЎ БЕЛАРУСАМІ І ЛІТВІНАМІ.

ШТО ПАКАЗАЎ ЛЕГІЯНЭРСКІ ЗЬЕЗД.

ПАЛІТЫЧНЫЯ ПЛЕТКАРЫ.

ВІЛЬНЯ, 13-8. Маёнак зьезду легіянэраў у Вільні пакідае міжвольна ўражаньне, што афіцыёзныя і інспіруемыя польскія колы, калі не садзейнічалі, дык, ва ўсякім выпадку, не перашкаджалі стварэньню наўкола зьезду легіянэраў атмасферы згушчаных палітычных плёткак. Вільня ў гэтым годзе была абрана легіянэрамі для свайго зьезду дзеля палітычнае дэманстрацыі.

Задуманая палітычная дэманстрацыя, бязумоўна, правалілася. Горад, які ў сваёй большасьці населен нацыменшасьцямі, холадна адносіўся да ўрачыстасьцяў.

АРЫШТЫ Ў МЭТАХ БЕЗАПАСНАСЬЦІ.

Напярэдадні зьезду дзеля „абароны" высокастаўленых гасьцей былі ўчынены шматлікія арышты сярод літоўцаў і іншых «ненадзейных». Арыштавана каля 45 чалавек.

Беларускае і літоўскае насельніцтва Вільні, зразумела, зусім байкатавала ўрачыстасьці. З боку жўрэяў, якія складаюць значны процант насельніцтва Вільні, бралі ўдзел ва ўрачыстасьцях толькі афіцыйныя асобы, яўрэйскія-ж масы на сьвятах адсутнічалі.

ПУСТЫ СТРЭЛ.

Заява віленскага ваяводы Рачкевіча аб тым, што ён ад імя ўсяго віленскага жыхарства і ўсяго жыхарства даверанага яму краю ўсім сэрцам далучаецца да легіянэрскага сьвята, прагучала як пусты стрэл і выклікала іранічную ўсьмешку сярод чужаземных карэспандэнтаў.

Што датычыць настроў саміх легіянэраў, дык нельга было не заўважыць, што няма ранейшага легіянэрскага адзінства. Не зважаючы на ўсе штучныя меры, сярод легіянэраў, падзеленых рознымі ступенямі кар'еры, чыноў і рангаў, нельга было заўважыць ранейшага «братэрскага пачуцьця, якое лічылася традыцыяй колішніх легіянэраў. Нават старонным гледачом кідалася ў вочы, што ў лягеры легіянэраў ёсьць раскол. Складаліся зграі, якія падтрымліваюць асобных канкуруючых між сабой правадыроў.

РАСЧАРАВАНАСЬЦЬ ПРАМОВАЙ ПІЛСУДЗКАГА.

Выступленьне Пілсудскага чакалі з вялікім напружаньнем. Але ягоная прамова, прысьвечаная выключна ўспамінам, выклікала расчараваньне як сярод чужаземных журналістаў, якія прыехалі ў вялікім ліку ў Вільню і спадзяваліся сур'ёзных палітычных дэкларацый ці нават падзей, так і, галоўным чынам, сярод удзельнікаў зьезду. Сэнтымэнтальныя словы Пілсудскага аб Вільні, ягоныя заявы навіталт «Вільня павінна быць маёй», —усё гэта, як выявілася, было ня досыць моцным для аўдыторыі.

П'ЯНЫЯ АФІЦЭРЫ МАХАЮЦЬ ШАБЛЯМІ.

Гэта знайшло свой выраз у выгуках некаторых афіцэраў пасьля прамовы Пілсудскага. «Даёш Коўню», «Давай сюды Вальдэмараса» і г. д. Гэтая дэманстрацыя падзіўшых афіцэраў была зараз-жа ліквідавана.

У Вільню прыехала 22 чужаземных журналісты — прадстаўнікі савецкае, ангельскае, амэрыканскае, нямецкае, латвійскае і літоўскае прэсы.

НА ЗЬЕЗДЗЕ 17 ЛІТОЎСКІХ ЖУРНАЛІСТАЎ.

Асаблівую сэнсацыю выклікаў прыезд літоўскіх журналістаў, якія ўпяршыню прыехалі ў Вільню не акольнаю дарогаю, а непасрэдна праз польска-літоўскую граніцу. Гэта настойліва падкрэсьліваецца ўсім польскім друкам.

«З Коўні на ўрачыстасьці прыехала 7 журналістаў, на чале з рэдактарам афіцыёзу «Летувос Аідас» Багдонасам. Багдонас даў інтэрв'ю прадстаўніком польскага друку, у якім заявіў наступнае: «У апошні час было шмат гутарак аб канцэнтрацыі войск па абодвых бакох польска-літоўскае граніцы. Абавязак журналістаў—ведаць аб праўдзе. З гэтаю мэтаю мы перасхалі граніцу, тым больш, што зьезд легіянэраў выклікаў у Коўні і ва межамі розныя палітычныя перагуды. Треба прызнаць, што мы не заўважылі канцэнтрацыі войск. Усюды спакойна. Ніхто зараз сур'ёзна не адносіцца да чутак аб магчымасьці блізкае вайны між Польшчай і Літвой».

У адказ на запытаньне, што трэба зрабіць, каб дасягнуць поўнага супрацоўніцтва паміж Польшчаю і Літвою, Багдонас заявіў, што гэта магчыма толькі пасьля ўпарадкаваньня віленскага пытаньня.

Патрэбна адзначыць, што літоўскія журналісты прыехалі ў Вільню водгук асабістага дазволу Вальдэмарэса. У пачатку-ж літоўскае міністэрства ўнутраных спраў адмовіла ім.

ІНТЭРВ'Ю ГАЛУЎКІ З ЛІТВІНАМІ.

Літоўскія журналісты прасілі інтэрв'ю ў Пілсудскага, але ў гэтым ім адмовілі. Замест Пілсудскага інтэрв'ю ім даў начальнік усходняга дэпартамэнту міністэрства замежных спраў Галуўко. У сваёй гутарцы апошні заявіў: «Усе весткі аб канцэнтрацыі войск выяўляюцца плёткамі. Польшча згодна наладзіць перамовы з Літвою і ў Кёнігсбэрзе, калі Літва ня можа іх весьці ў Жэневе. Але ў гэтым выпадку Залескі будзе пазбаўлены магчымасьці асабіста кіраваць перамовамі з польскага боку".

Галуўко заявіў, што ненармальныя адносіны між Польшчаю і Літвою часта ставяць Літву ў трагі-камічнае становішча. Між іншым, згодна слоў Галуўко, толькі дзякуючы ненармальным адносінам можна вытлумачыць той перапуд, які быў выкліканы у Коўні ў зьвязку са зьездам легіянэраў. „Нам вядома, што жыхарства Літвы,— заявіў Галуўко,—сьпешна запасаецца харчамі і купляе амэрыканскія даляры, знаходзячыся пад тэрорам распаўсюджаных чутак у сувязі са зьездам".

На прыём у віленскага ваяводы, на які былі запрошаны ўсе чужаземныя журналісты, літоўцы не зьявіліся.

ЗЬЕЗД НЕ ДАСЯГНУЎ ПАСТАЎЛЕНЫХ МЭТ.

Падагульняючы вынікі зьезду легіянэраў, трэба падкрэсьліць наступныя моманты: 1) зьезд меў на мэце даказаць адзінства легіянэраў і іхнюю абсалютную адданасьць Пілсудскаму; 2) на зьезьдзе павінна была знайсьці свой выраз катэгарычная пазіцыя Польшчы ў віленскім пытаньні. Прыясанасьць легіянэраў і самога Пілсудскага да Вільні падкрэсьлівалася на кожным кроку; 3) нарэшце, зьезд павінен быў падкрэсьліць гатоўнасьць усяго лягеру Пілсудскага рашуча падтрымаць усе праэктуемыя ім меры ва ўнутранай палітыцы Польшчы і, у першую чаргу, у пытаньні аб рэформе канстытуцыі.

Усе гэтыя тры моманты падкрэсьлены ў рэзалюцыі зьезду, якая зрэдагавана ў форме прывітаньня - прысягі на імя прэзыдэнта рэспублікі Масьціцкага.

Нумізматычны скарб.

Гэтымі днямі ў народны музэй Белграду адвіз сербскі селянін дастаўлі 4500 старых манэт, якія ён выкапаў з зямлі ў часе палявых работ на сваім надзеле. Усе знойдзеныя ім манэты находзяць в трэцяга веку нашай эры. Атрымаўшы за іх узнагароду, шчасьлівы вынаходца стаў далей капаць і знайшоў яшчэ 7500 манэт.

Пасьля вычысткі гэтых манэт у белградзкім музэі, сьцьвярдзілі сярод іх экзэмпляры вельмі рэдкія, як, напрыклад, з адбіткам рымскага цэзара Аўрэліяна і яго жонкі Сэвэрыны Аўгусты, нязвычайна добрай выканаўнія. На манэце знаходзіцца надпіс: «Орыэнс Аўгусці» і адбітак бога сонца, у ступень ног якога ляжыць нявольнік.

Прадстаўнік Лігі Нацый у Вільні.

ВІЛЬНЯ, 13-8. У Вільню ў дзень зьезду польскіх легіянэраў прыехаў прадстаўнік Лігі Нацый Жорж Отлік. Падарожжа яго стаіць у вывязку з скаргамі літоўскага ўраду на польскія ўзброеныя падрыхтаваньні.

Пахаваньне Сьцяпана Радзіча.

КІРАЎНІКІ ПАРТЫІ РАДЗІЧА САРВАЛІ СПРОБЫ МАС ДЭМАНСТРАВАЦЬ ПРОЦІ ЎРАДУ.

ВЕНА, 13-8. Як паведамляюць з Белграду, пахаваньне Радзіча прайшло бяз усякіх здарэньняў. У працэсіі брала ўдзел 100.000 чал. Каля 200.000 гледачоў згрупавалася на шляху, дзе ішла працэсія. Урадавыя партыі ў працэсіі ўдзелу ня бралі.

Выступаўшыя на хаўтурах адзначалі, што палітычным ідэалам Радзіча было заснаваць федэратыўную дзяржаву харватаў, сэрбаў, славенцаў і баўгар. Прамоўцы ўрачыста абяцалі ня спыняць барацьбы супроць «гегемоніі Белграду».

Напярэдадні пахаваньня дэмакратычна-сялянская кааліцыя гарантавала ўладзе захаваць парадак на пахаваньні. З гэтае прычыны паліцыя і жандармерыя ў пахаваньне не мяшаліся.

СЭРБСКІ СЯЛЯНСКІ САЮЗ СПЫНІЎ ГУЛЬНЮ Ў АПАЗІЦЫЮ.

ВЕНА 13-8. Згодна паведамленьня з Белграду, у Скупшчыне (юга-лаўскі парлямант) скончыліся спрэчкі аб дэкларацыі ўраду. Большасьцю галасоў партый, якія засталіся ў скупшчыне пасьля выхаду сялянска-дэмакратычнае кааліцыі, супроць галасоў сэрб скага-сялянскага саюзу і партыі немецкае меншасьці, ухвалена рэзалюцыя давер'я ўраду. Потым скупшчына, водгук прапазіцыі камісіі аб пытаньні дэпутацкае недатычнасьці ўхваліла выдаць судовай уладзе дэпутата Рачыча—забойцу Радзіча і іншых дэпутатаў.

Між урадовымі партыямі і сэрбскім сялянскім саюзам, які да апошняга часу прытрымліваўся тактыкі абструкцыі, дасягнута згоды аб праграме прац у скупшчыне.

АНТЫРЭФАМІСЦКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ БЭРЛІНСКІХ СПАРТСМЭНАЎ.

БЭРЛІН, 10-8. Учора адбылася дэманстрацыя пратэсту проці спробы рэфармістаў стварыць раскол у нямецкім рабочым спартыўным руху. Удзельнічала 25.000 членаў бэрлінскага рабочага спартсаюзу.

У Саюзе ССР.

Цэны на муку і печаны хлеб.

Пастанова калегіі НК Гандлю СССР

МАСКВА, 13-УШ. Калегія НК Гандлю СССР ухваліла ўвесьці з 15-га жніўня для дзяржаўных і кааператыўных хлебагандлюючых арганізацый новыя канчатковыя прадажна-аптавыя цэны на жытню, абойную і пшанічную муку.

Каб захаваць у асноўных рабочых раёнах хлебныя цэны на існуючым узроўні і стварыць умовы для бясстратнае працы хлебавыпякаючых арганізацый, з таго-ж 15-га жніўня ўводзіцца бонус (зьніжка) з оптавае пралежнае цаны на муку, якая адпушчаецца для арганізаванага хлебавыпеку. Бонус гэты распаўсюджваецца на Маскоўскую, Іваво-Вазнясенскую і Ніжагародзкую губэрні, Яраслаўль, Рыбінск, Цьвер, Вышні Валачок, Уладзімерскую губ., горад Ярцава, Смаленскае губ., Бранскую губ., Ленінград, Сестрарэцк, Кранштадт, Кастраму, Іжэўск, Баку з нафтавым раёнам, Харкаў, Данбас, Мікалаеўск, Адэсу, Днепрапятроўск, Запарожжа, Крывы Рог, Растоў, Шахты, Грозны, Таганрог, Сталінград, рабочыя раёны Уралу і Кузьнецкі басэйн.

Наркаматам гандлю саюзных рэспублік і гандаль-аддзелам галоўнейшых прамысловых пунктаў, у якіх адпушчаецца мука для арганізаванага хлебавыпеку, прапанована ні ў якім выпадку не дапушчаць павышэньня цэн на аснаўныя гатункі выпечанага хлеба і даваць дазвол у неабходных выпадках толькі павышаць цану на ненармаваныя булачныя і цукерныя вырабы.

У іншых раёнах, дзе бонус не ўстаноўлены,—дазваляецца павышаць цэны на жытні і пшанічны выпечаны хлеб, але ня больш 1 кап. на 1 кілёграм. Павышаць цэны на выпечаны хлеб дазваляецца толькі пасьля дакладнае праверкі выдаткаў, зьвязаных з хлебавыпекам. Перагляд цэн на выпечаны хлеб, аднак трэба рабіць так, каб выпечка хлеба на ўсіх яго гатунках ня прыносіла страт. Дазваляецца некаторая страта толькі па нізкіх гатунках масавага спажываньня з кампэнсацыяй страты прыбыткам на другіх гатунках.

Каб захаваць існуючыя прадажныя цэны ў галоўнейшых раёнах скапленьня транспатных рабочых, калегія НК Гандлю палічыла патрэбным пашырыць бонус на муку, якую адпушчае транспатная кааперацыя для хлебавыпеку ў гэтых раёнах. Сьпіс пунктаў павінен скласьці Цэнтрасаюз у згодзе з УЦСПС і ён будзе зацьвярджан НК Гандлю СССР. У гэты сьпіс могуць быць уключаны і чыгуначныя пункты і не ў раёнах, на якія распаўсюджваецца бонус, але якія зьяўляюцца адзінымі рабочымі цэнтрамі гэтых раёнаў. Устанаўленьне ў адным і тым-жа пункце розных цэн на муку і выпечаны хлеб для чыгуначных рабочых і рабочых іншых галін прамысловасьці не дазваляецца.

Наркаматам гандлю саюзных рэспублік і гандёвым аддзелам загадана ўстанавіць да 13-га жніўня разьмер належачае да водпуску в 15 жніўня мукі для арганізаванага хлебавыпеку.

З дзень усесаюзнае спартакіяды

МАСКВА. 13-га жніўня—трэці дзень спартакіяды— адбыліся спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, футболе, гарадкох, плаваньні, баскетболе і інш. Цэнтральнай падзеяй дню быў матч футбольных камад Украіны і Уругваю, які скончыўся перамогаю Украіны і выхадам Уругваю з гульні.

Упяршыню ў другім коле гульняў выступала найбольш моцная футбольная каманда-швэйцарская. Яна выйграла ў Цэнтральна-Земляробчага райёну в рахунках 7:1 і, як відаць, зьявіцца адным з претэндэнтаў на першае месца па футболе.

У бягах на 500 мэтраў для жанчын—новы ўсесаюзны рэкорд паказала Гродзкая (Масква)—1 хвіл. 23,4 сэк. Бег на 5.000 мэтраў для мужчын па мокрай дарожцы выйграў фін Ісахолла, у 15 хв. 42,8 сэк.

У цэнтральным Доме Чырвонае арміі пачаліся спаборніцтвы па фэхтаваньні. Былі праведзены напярэдадні баёкі для камскладу РСЧА, у якіх брала ўдзел 43 чалавекі. У выніку спаборніцтваў вышла ў фінал 12 чалавек.

Адбыліся таксама выпярэдніцтвы па эскарроне, пры ўдзеле 23-х чалавек ад 10 райёнаў. На першым месцы ў першы дзень —Захараў (Паўночны Каўказ)—сем перамогаў.

Па гарадкох адбыліся чатыры спаборніцтвы. Паўночны Каўказ выйграў у Цэнтральна-Прамысловага райёну. Паўночны райён—у Урала. Масква выйграла ў моцнай барацьбе з Закаўказьвом, Паволжа—ў Крыму.

У спаборніцтвах па плаваньні на 400 мэтраў вольным штылем Кітаец (Ленінград) дасягнуў новага ўсесаюзнага рэкорду—ў 5 хвілін 55 сэк. У плаваньні на 100 мэтраў на баку для жанчын—першае месца заняла Свэрдзілава (Ленінград)—1 хв. 41,4 сэк. У плаваньні на 100 мэтраў для мужчын выйграў Шумін (Ленінград)—1 хв. 25,2 сэк. (лепшыя рэкорды).

Учора-ж адбыліся спаборніцтвы другога кола гульні па футболе. Паволжа выйграла ў Туркмэністану 6:0, Украіна ў Уругваю 3:2, Швэйцарыя ў Цэнтральна-Земляробчага райёну—7:1, Фінляндыя ў Сібіру—3:2, Ленінград у Узбекістану—9:0 і Масква ў аўтаномных рэспублік.

У першым коле камандных спаборніцтваў па тэнісе Крым абыграў Волскі райён з вынікам 7:4, Туркмэністан прайграў Сібіру в вынікам: 11:0; Паўночны Каўказ выйграў ў Цэнтральна-Прамысловага райёну з вынікам 9:0.

Па волей-боле адбылося два спаборніцтвы: мужчынскіх камад Масквы і Паўночнага Каўказу і жаночых камад Паўночнага Каўказу з Закаўказьвом. У першым спаборніцтве перамагла Масква в вынікам 2:0, а ў другім Паўночны Каўказ з тым жа вынікам—2:0

Па баскетболе адбыўся матч сустрэчаў. Заслугоўвае быць адзначаным спаборніцтво Туркмэністану з Украінай. Туркменская каманда перамагла в вынікам 16:4.

БАЛТЫЦКІ ФЛЁТ НА ВЫШЫНІ СВАЙГО СТАНОВІШЧА.

МАСКВА, 13-8. Абвешчан загад Рэвалюцыйна-Вайсковага Савету СССР за подпісам т. Варашылава.

«Бяручы ўдзел у вялікім паходзе Чырвонага Балтыцкага Флёту в 6-га да 12-га жніўня,—гаворыцца ў загадзе,—я назіраў за вучэбнаю працаю, баявою слумбаю і практычнаю асабовага складу баявых карабляў Каманды агледжаных мною караблёў былі ў уз

ПРЫВІТАЛЬНАЯ ТЭЛЕГРАМА

Старшыні ЦВК СССР тав. Чарвякову.

4 Усесаюзны зьезд Саюзу Эсэрантыстаў Савецкіх Рэспублік Усесаюзнай Асацыяцыі Прыняцелаў Міжнароднае мовы вітае ў вашай асобе вярхоўны орган Савецкае ўлады—вынік першае пераможнае пралетарскае рэвалюцыі, утварыўшай шырокія магчымасьці для пралетарскага грамадзкага руху за міжнародную мову.

Цьвёрда перакананыя ў далейшым, гістарычна неўхільным і неабходным павялічэньні ліку Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, мы прысьвечаем свае сілы вырашэньню праблемы міжнароднае мовы, як аднаму з сродкаў барацьбы за пралетарскую салідарнасьць—базу сусьветнага СССР.

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЕЗДУ.

Страты польскіх паноў ад нашай рэвалюцыі.

Нейкі З. П. у «Кур'еры Варшаўскім» (№ 211) прыводзіць статыстычныя даныя аб стратах, якія панесьлі польскія паны, дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Даныя гэтыя досыць цікавыя, і на іх ня можна не зьвярнуць увагі, як роўным чынам і на тыя пабудкі, якімі кіраваўся аўтар, пішучы свой артыкул.

«Паводле перадвоеннай статыстыкі, піша З. П.—па цэлым абшары Украіны, якая ляжыць на правым баку Дняпра (Кіеўшчына, Валынь і Падолія), вялікая абшарніцкая ўласнасьць у руках палякаў лічыла 2.202.210,21 дзесяцін, ці больш-менш 2.300.000 гэктараў. Няпольская — 2.333.597,09 дзес. У адносінах да ўсіх абшарніцкіх зямель складала 48,5 проц. Буйных абшарнікаў на правабярэжнай Украіне было 4.638, у той лічбе палякаў—2.124 ці 45,8 проц. Сярэдняя польская ўласнасьць раўнялася 67.662.57 дзес. (26 проц. у адносінах да агульнага абшару сярэдняй уласнасьці, які раўняўся 280.208,15 дзес.) На 7.831 сярэдніх уласнікаў палякаў было 1760, ці 22,7 проц. Агульны абшар меншай польскай уласнасьці раўняўся 29.186,39 дзес., ці ў адносінах да ўсяе ўласнасьці гэтай катэгорыі, якая раўнялася 193.336.97 дзес., польская меншая ўласнасьць складала 15,1 проц. На 15.257 меншых уласнікаў палякаў было 2.172, ці 14,2 проц. Агулам—усіх трох катэгорый уласнікаў-палякаў было 6.056, якія ўладалі 2.299.059,17 дзес., ці звыш двух з паловаю млн. гэктараў.

Паводле вылічэньняў Я. Барташэвіча, зробленых у 1912 г., вартасьць усяе нярухомае польскае ўласнасьці на Украіне перавышала суму 556 млн. рублёў, ці больш-менш ад 2 міліярдаў 780 млн. злотых да 3.250.000.000 злотых».

Вылічыўшы страты польскіх абшарнікаў па правабярэжнай Украіне, пан З. П. успомніў, аднак, што частка Украіны адышла па Рыскаму міру да Польшчы, і таму ён, урэшце, згаджаецца адлічыць ад агульнай вартасьці страчанай польскай уласнасьці адну восьмую частку, і тады, па яго словах, страта будзе раўняцца 2.844.000.000 злотых.

Адносна беларускіх зямель аўтар дакладных лічбаў ня прыводзіць. Прыблізна, аднак, ён акрэсьлівае страты польскіх паноў на землях Усх. Беларусі ў колькасьці 1.900.000.000 злотых Разам-жа страты польскіх абшарнікаў па украінскіх і беларускіх землях раўняюцца, як кажа З. П., да 5 міліярдаў злотых.

Агульная вартасьць гатовай прадукцыі прамысловасьці, паводле падлічэньня З. П., раўнялася да вайны на беларускіх землях 163.083.450 руб., ці звыш 815.000.000 злотых, з чаго найменш шостая частка—каля 136 млн. зл. прыпадае на польскую прадукцыю. Калі адлічыць трэцюю частку, прыпадаючую цяпер на землі, якія належаць да Літвы і Польшчы, то будзем мець каля 90 млн. злотых вартасьці прамысловасьці, абапёртай на польскіх капіталах, апрача зямельнай прадукцыі.

Вартасьць зьнішчаных або адабраных фабрык, прадпрыёмстваў і г. д. на Украіне і Беларусі пан З. П. ня можа падлічыць, як ня можа ён падлічыць вартасьці маемасьці, адабранай у палякаў у глыбі Расеі, у Сібіры і на Каўказе. Гэта, піша З. П., таксама міліярды.

Дзеля чаго-ж пан З. П. прарабіў такія вылічэньні страт польскіх капіталістаў на абшарах СССР?

А вось дзеля чаго. Аўтар пытаецца: «Ці саветы зьвернуць усё гата пакрыўджаным?»

Ня будучы пераконаным у гэтым, пан З. П. дадае:

„У кожным выпадку, мы не павінны зракацца гэтых аграмадных сум».

Ну, што-ж, можаце не зракацца, паны абшарнікі. Цешцеся з гэтае думкі, што яна калі-небудзь зрэалізуецца. Усё-роўна нічога з гэтага ня будзе. Ні грошаў за «страчаныя» абшары, ні саміх абшараў вам ужо ніколі ня ўбачыць, як сваіх вушэй. А падлічаць страты вам ніхто не забараняе.

Беларускі-ж і украінскі народы, землі якіх вы ў працягу доўгіх вякоў эксплёатавалі, могуць прад'явіць вам контррахункам, па якому акажацца, што ня мы вам павінны выплаціць 5 міліярдаў злотых, а вы нам сотні міліярдаў рублёў

М. Л—н.

АДСТАЎКА ПРЭЗЫДЭНТА ЛАТВІІ

Прэзыдэнт Латвіі Зэмгаль пастанавіў зрачыся пасады прэзыдэнта. Адстаўка Зэмгаля выклікана яго намерам узяць удзел у выбарнай кампаніі ў якасьці галоўнага кандыдата дэмакратычнага цэнтру.

Запытаньне т. Дорыё ў палаце.

ПАРЫЖ, 10-8. Камуністычны дэпутат Дорыё падаў у палаце дэпутатаў запытаньне адносна парушэньня волі сходаў в боку французкае ўлады ў часе маніфэстацыі ў Іўры.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

РЭПРЭСІІ ПРОЦІ ЛАТВІЙСКІХ ЛЕВЫХ ПРАФСАЮЗАЎ.

РЫГА, 3-8. Мітаўскі акруговы суд прыпыніў дзейнасьць левых прафсаюзаў у Мітаве па абвінавачаньні ў антыдзяржаўнай дзейнасьці.

Арыштавана 4 ойбры прэзыдыуму цэнтральнага бюро рыскіх прафсаюзаў, якім робяць закід у камуністычнай дзейнасьці. Арыштаваныя вызвалены пад заклад.

Будаўніцтва за граніцай.

«Роботник» (№ 216) прыводзіць даныя аб будаўніцтве за граніцай пасьля сусьветнай вайны. Аказваецца, што ў Англіі ад канца 1918 г. да 1926 пабудавана 654.000 жылых дамоў на суму поўміліярду фунтаў. У Бэльгіі ў 1921 г. было ўжо пабудавана новых дамоў 150 тыс. Нямеччына за час ад 1919 да 1926 г. пабудавала 800 тыс. дамоў.

Быдла маршалка Пілсудзкага.

На «ўсходніх таргох», якія ў хуткім часе адчыняюцца ў Вільні, выстаўлены будуць тры штукі чырвонага быдла з маёнтку Сьвятнікі, уласнасьць марш. Пілсудзкага.

Новая стратэгічная лінія ў Польшчы.

9 жніўня ў прысутнасьці міністра шляхоў зносін адчынілася новая чыгуначная лінія Сталноў-Луцк недалёка ад польска-савецкай граніцы. Лінія гэта частнаю была пабудавана яшчэ ў часе сусьветнай вайны расейцамі і аўстрыякамі.

НОВЫ ВУЛКАН.

БЭРЛІН. Па высьпе Флёрэс (Малайскі Архіпэляг) аднавілася дзейнасьць вулкану. Загінула 20 параходаў. Выбух вулкану моў чалавецкія ахвяры.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Вылучэнец апраўдаў сябе на ўсе 100 проц.

Чатыры гады загадчыкам Магілеўскага вадаправоду і тэхнічнае часткі Магілеўскага Камунальнага Трэсту быў інжынэр Задушэўскі. Вадаправод дрэнна здавальняў насельніцтва вадой, усе будаўнічыя работы вяліся без усякага пляну. Звольніўшы спэца з пасады а на яго месца ячэйка вылучыла токара заводу „Чырвоны Адраджэнец" т. Тарасэвіча. З гэтага часу пайшла кіпучая праца на Магілеўскім вадаправодзе. Адбудаваны запасныя бакі для сховы вады каля 40.000 вёдраў. Папраўлены ўсе будынкі. Вадаправод, хоць стары, але поўнасьцю забясьпечвае насельніцтва, няма ніякіх нараканьняў.

Скончаныя рамонты ў гэтым годзе паказваюць усе дасягненьні за гэты час. Вадаправод выглядае як лялька. Белыя сьцены, як унутры, так і звонку. Прыбытковая частка Магілеўскага вадаправоду павялічылася. Пры кіраваньні вадаправодам ранейшым загадчыкам ён даў страту каля 3-хсот рублёў за мінулы 1925-26 год, а пры кіраваньні сучаснага загадчыка--вылучэнца т. Тарасэвіча ў 27-28 г. вадаправод даў прыбытак каля 8772 руб. 95 кап. Няма ўжо і той запазычанасьці ва кліентамі, якая была ў 25-26 г. У 26-27 г. Магілеўскі вадаправод першым на апал торфам і выкарыстаў каля 2-хсот кубоў тарфянага апалу.

У гэтым паўгодзьдзі Магілеўскі вадаправод першаму цалкам на тарфяны апал. Апалам забясьпечаны на 4 месяцы. Па ўсіх галінах значна зьніжаны выдаткі. За 27-28 г. першае паўгодзьдзе дало прыбытак у суме каля 6 тыс. руб. (шэсьць тысяч руб).

Вылучаныя таварышы з ячэйкі мэханічнага заводу «Чырвоны Адраджэнец» кажуць, ну і Тарасэвіч паказаў спэцам, як трэба будаваць нашу сацыялістычную гаспадарку, апраўдаў на ўсе сто проц. даў сваю пасаду.

Магілеў. І. Ж.

Непарадкі ў камбінаце.

Карма, Магіл. акр. 12-8. У камбінаце імя Войкваа аграном Пляскоў нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў.

Калі засявалі яравы клін—дык ён яе „спэц" проста наўмысьля загадаў садзіць бульбу якраз у тых месцах поля, дзе стаяла вада, а ў сухіх месцах—а ні бульбінкі...

У выніку—тры дзесяціны, на якіх пагніла бульба, прышлося адсейваць зноў. Гаспадарка-ж камбінату атрымала страты.

Загадчык—Кавалёў сам мала чаго дяміць у гаспадарцы і пакладаецца ўва ўсім на свайго памоцніка—гэтага самага «агранома».

А в гэтым спэцам далёка не ад'ездзеш; вунь сёлета і лён, пасеяны ў навальніцу, ня ўзыходзіў яшчэ...

Пабудова клінкернага заводу.

Бабруйск, 13-8. У пяцігадовы плян разьвіцьця Бабруйшчыны ўключана пабудова клінкернага заводу. (Клінкер—асобны від цэглы, якая апальваецца ў больш высокай тэмпэратуры, чым звычайная цэгла). Клінкер пойдзе на машэньне дарог і вуліц. У шмат якіх мясцох ён ужо замяняе камень для маставых.

Адчыняецца ільнаапрацоўчы пункт.

Магілеў, 13-8. Пры Чарнянскім ільнаводным таварыстве, Шклоўскага райёну (адзінае пакуль-што гэткае таварыства ў акрузе) адкрываецца ільнаапрацоўчы пункт, на які паступаюць чатыры ільнатрапальныя і пенькатрапальныя машыны. Зараз пры таварыстве існуе пракатны пункт глебаапрацоўчых машын, патрэбных пры культуры ільну.

Ня доўга панавалі.

У Барысаўскім райёне, Зембінскага с.-с. яшчэ ў той час, калі Зембін быў райёнам, арганізаваўся калгас «Кімія». У гэты калгас былі ўцягнуты кулакі, якія ў сваю чаргу прымалі ў хэўру сваіх родных і знаёмых. З усіх сяброў калгасу быў толькі адзін батрак, але і таму ўзялі для формы. Самым галоўным заправілам калгасу стаяў вядомы кулак Каротні, які ўсімі мэтадамі стараўся давясьці гаспадарку калгасу да поўнага разбурэньня, каб атрымаць потым дапамогу ад дзяржавы. Такім чынам восеньню ён распрадаваў семянную бульбу па 20-25 к. за пуд, а з наступленьнем вясны купляў яе па 40-50 к. Пасеяны лён увесь застаўся на полі і згніў, ад недахопу корму здохла 15 авец і г. д. З усімі гэтымі зьявішчамі няўстанна вёў барацьбу сябра калгасу т. Чура, які ненарокам папаў туды.

Злачынныя прадзелкі кулака Каротка і яго кампаніі аказаліся высьветленымі. Увесь стары калгас расфарміраван, заправілы, якія даводзілі гаспадарку да зьнішчэньня і растрацілі 700 р. грошай, аддаюцца пад суд.

Цяпер калгасам упраўляюць батракі і беднята.

А. Станкевіч.

Барысаў.

Арганізацыя групавых калгасаў.

Бабруйск, 14-VIII. На наступны гаспадарчы год акруговы с.-г. саюз міркуе лік абʼяднаньняў калгасаў давесьці да 6. Пры гэтых групавых калгасах будуць працаваць аграномы. Апошнія будуць утрымоўвацца за кошт калгасаў.

На месцы быўшых карчоў.

Магілеў, 13-8. Вельмі ўсхваляваліся экскурсанты-сяляне, якія наведалі апорны пункт на асушаным вучастку ў вурочышчы «Котуш» (каля Магілеву).

— Гэта-ж украінскія ўраджаі!—кажуць яны.

— І гэта пры сёлетнім неспагадлівым дажджлівым надвор'і!—дадаюць другія.

У самай рэчы.

На месцы быўшых карчоў на асушаным балоце яны ўбачылі і авёс, і канюшыну, і віку, і бульбу, і турнэпс, капусту і капусту. І ўсё добра расьце.

— Калі-б ня ўбачылі самі, дык не далі-б веры!

— Добра робіць савецкая ўлада, што праз сваіх спэцыялістаў пераконвае сялян у мажлівасьці ператварыць быўшыя пустошы ў высока-ўраджайныя палі.

— Няхай на падобныя вузорныя вучасткі наведаецца як мага больш сялян!

Вынікі дню „Чырвонай кветкі".

Бабруйск, 13-8. Акругкомам і Гаркомам Мопр'у быў праведзен нядаўна дзень «Чырвонай кветкі» на карысьць кітайскіх рэвалюцыянэраў.

Кружачны збор па Бабруйску і Клічаўскім р-не даў звыш 400 руб. Ад іншых райёнаў яшчэ зьвестак няма.

Новыя кантрольныя камісіі на чыгунцы.

Гомель, 14-8. Дорпрафсож парашыў пашырыць сетку часовых кантрольных камісій. Па прапанове дорпрафсожу арганізаваны часовыя кантрольныя камісіі ў галоўных майстэрнях, 3 і 5 на вучастках цягі і ТД Бахмач. Камісіям даручана прапрацаваць пытаньне аб якасьці рамонту і прастоях, прычым камісіі галоўных майстэрняў даручана прапрацаваць пытаньне капітальнага рамонту паравозаў, 3 і 5 вучасткам цягі—на сярэднему рамонту, а ТД Бахмач—канвэнцыйны рамонт вагонаў.

Арганізаваны часовыя кантрольныя камісіі па вучастках дарогі, якім даручана прапрацаваць пытаньне аб якасьці і своечасовасьці выкананьня заказаў, аб недахопах капітальнага будаўніцтва. Па службе руху таксама арганізаваны 2 кантрольныя камісіі для прапрацоўкі пытаньня аб выкарыстаньні рухомага складу. Усім кантрольным камісіям прапанавана скончыць сваю працу да 1-га кастрычніка 1928 г.

Прыкладны пачын.

Барысаў, 11-8. 15-га жніўня Барысаўская арганізацыя ТДА-Авіяхіму выпушчае другі нумар шматтыражнай насьценнай газэты.

Гэты нумар маецца быць выпушчаным у друкаваным выглядзе.

Дапамога бяспрытульным.

Ворша, 10-8. Камсамольскія арганізацыі ў месячнік барацьбы з бяспрытульнасьцю будуць наладжваць суботнікі, зьбіраць сродкі па падпісных лістох. Будзе зроблена абсьледаваньне дзіцячых садоў і ўстаноў. Акруговая Дзіцячая Камісія в 15 жніўня адчыняе лётарэю на карысьць бяспрытульных.

Пажары ў Аршаншчыне.

Ворша, 14-VIII. Зараз па Аршаншчыне ўчасьціліся выпадкі пажараў. нядаўна ў Чарэйскім райёне, у в. Рожанках згарэла 26 хат, 4 каровы і іншая дробная жывёла, на агульную суму каля 8000 руб. [illegible] рыках, Чарэйскага р., згарэла 8 хат і іншыя будынкі, жывёла, усяго страт да 3000 руб. У Копыскім райёне згарэла моцная гаспадарка каштоўнасьцю каля 2000 руб.

С.-с. карыстаецца аўтарытэтам.

Нельга лічыць апошнім Рыжкаўскі сельсавет. Па спагнаньню сельгаспадатку ён займае амаль ня першае месца ў райёне. Добра прайшло і самаабкладаньне, на сродкі якога пабудавана 7 мастоў, адрамантаваны ўсе дарогі. Сяляне цяпер кажуць: «Во, дарогі сталі, як пры немцах былі». Будуюцца дзьве школы. Сяляне гэтых вёсак—. Данькавіч і Загор'я прынялі яшчэ дадаткова самаабкладаньне на 15 проц.

Землянарадкаваны 3 вёскі з ліку —11 і яшчэ 2 вёскі ў гэтым годзе ўжо землянарадкоўваюцца. Арганізоўваецца адзін калгас.

Скаргі насельніцтва выконваюцца с.-с. своечасова.

І прэзыдыум с.-с. карыстаецца пашанай ад насельніцтва, але прыкмячаецца паслабленьне аўтарытэту яго, напрыклад: аб утойшчыках абʼектаў па с.-г. падатку скаргі падаюцца прама ў РВК.

Мала зьвяртае с.-с. увагі на камісіі пры с.-сав., якія зусім не працуюць.

Пленумы амаль што і ня былі за ўвесь летні час, ды і зімой не перабаршчылі ліку.

Канцэлярыя с.-савету працуе штодзённа ад 9 гадзіны раніцы і да 4 гадз. вечара акуратна.

Вялікім навальваньнем у працы с.-с. зьяўляюцца і сыстэматычная рэгістрацыя шлюбаў, якія перад падатковай кампаніяй, ды перад землянарадкаваньнем рэгіструюцца, а пасьля разрэгістроўваюцца. Над такімі справамі патрэбна было-б прыняць нешта рацыянальнае. І яшчэ адным недахопам с.-савету зьяўляецца адсутнасьць ініцыятывы ў членаў яго да гаспадараньня.

Тэфс.

В. Рыжкавічы, Шклоўскі р.

2-я пазыка індустрыялізацыі.

Мясцком ЦВК і СНК на першым месцы.

Да гэтага часу ў мясцкоме ЦВК і СНК падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі 42 працаўнікі на агульную суму 4100 руб. Кожны працаўнік падпісаўся на 120 проц. свайго месячнага заработку.

Падпісаліся на 10.000 руб.

Папярэдняя падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі сярод працаўнікоў Дзяржбанку праходзіць з посьпехам.

Амаль усе працаўнікі ўжо падпісаліся.

Агульная сума падпіскі—10.000 руб.

Першы дзень даў—3.400 р.

Учора, 14-га жніўня, распачалася папярэдняя падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі сярод працаўнікоў Дзяржпляну БССР. Першы дзень даў—3400 р. Падпіска працягваецца.

Падпіска праходзіць пасьпяхова.

Падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі сярод рабочых Менскага хлебазаводу распачалася.

Рабочыя ўжо падпісаліся на 3.885 руб. Падпіска праходзіць з посьпехам.

Міліцыянэры не адстаюць.

Гэтымі днямі распачалася падпіска на другую пазыку індустрыялізацыі сярод міліцыянэраў г. Менску. Ужо праведзена падпіска на 4.600 р. З гэтай колькасьці 1-шае аддзяленьне міліцыі падпісалася на 2500 руб.

На 3700 р. за 1 дзень.

Пасьпешна праходзіць падпіска на пазыку індустрыялізацыі сярод супрацоўнікаў Беларускага саматужна - прамысловага саюзу. За адзін дзень падпісаліся 22 служачыя на 3700 р. Служачы Мануловіч падпісаўся на 600 пр. месячнага акладу.

Першы дзень даў—760 р.

Папярэдняя падпіска на 2-ую пазыку індустрыялізацыі сярод супрацоўнікаў цэнтраземскладу распачалася 11-га жніўня.

Першы дзень падпіскі даў 760 руб, Падпісалася 9 чал.

Некаторыя супрацоўнікі падпісаліся звыш месячнага акладу.

Падпіска распачалася.

На агульным сходзе супрацоўнікаў Гоав. гандльслуж. 9 жніўня быў пастаўлен даклад аб 2-й пазыцы індустрыялізацыі. Пасьля гэтага сход вынес пастанову, падпісацца ўсяму саюзу на 100 проц., і на 100 пр. месячную пенсію. Такім чынам 60 членаў саюзу падпісаліся на 2400 р.

Чавускі р., Магілеўшчына.

Па ініцыятыве саміх працоўных.

ГОМЕЛЬ, 14-8. У шмат калектывах разгарнулася праца па падпіскі на аблігацыі пазыкі. Калектыў Акроуду падпісаўся на 2000 р., Дзяржбанку на 2700 р., Пасьсельсоюзу на 3950 р., Акрфінадзелу на 5335 р., Ларка на 2800 р., бойні на 1400 р.

Трэба адзначыць, што ўсюды падпіска праводзіцца па ініцыятыве саміх працоўных.

Нізавыя прафячэйкі і некаторыя грамадзкія арганізацыі нічога ня робяць для папулярызацыі пазыкі. Чакаюць інструкцыі або абежніка.

На месячны аклад.

У райёне пакуль што ніякіх зьвестак ня маецца, як распачаць працу па рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі, але-ж ня гледзячы на гэта, 9 жніўня была скліканая нарада прафактыву, на якой прысутнічала каля 47 асоб і абгаварылі пытаньне аб распачатку гэтай працы. Пасьля інфармацыі частка таварышоў выказалася ў спорах, якія галоўным чынам, зводзіліся таму, што на падпіску займа неабходна падпісацца ўсім супрацоўнікам райёну, што і было вынесена пастановай. Усе прысутнічаючыя падпісаліся на заём на колечны аклад сваей пэнсіі, у выніку чаго да тэрміну пачатку рэалізацыі пазыкі маем падпіскі на 1894 руб.

Для правядзеньня лепшай працы на далейшае, тут жа вылучана камісія ў складзе 5 асоб, якой даручана павесьці працу на даючнай падпіскі на пазыку.

Прапойскі р., Магілеўшчына.

На 200 проц. пэнсіі.

Праца па рэалізацыі другой пазыкі індустрыялізацыі на Азарыцкаму райёну распачалася. 10 жніўня адбылося пашырэнае пасяджэньня прэзыдыуму РВК з удзелам загадчыкаў усіх устаноў, дзе абгаварвалася пытаньне аб рэалізацыі пазыкі і выдзелена райённая камісія. Тут-жа пасля пасяджэньня прэзыдыуму, была зроблена падпіска сярод прысутнічаўшых асобаў, яная дала 1455 р. Некаторыя таварышы падпісаліся на 200 пр. месячнага акладу пэнсіі.

На сёнешні дзень г. ё. на 12 жніўня маецца падпіскі на 2075 руб.

На 13 жніўня назначан агульны сход сяброў саюзу і гр-н м. Азарыч, дзе будзе стаяць пытаньне аб другой пазыцы індустрыялізацыі і будзе праведзена падпіска.

Азарыцкі р., Мазыршчына.

Ільготны фонд трэба разьмяркоўваць своечасова.

Праўленьне Управы Дзяржстраху паведаміла акрвыканкомы аб сумах фонду ільгот для вызваленьня бяднацкага насельніцтва, сем'яў чырвонаармейцаў і былых чырвоных партызан ад аплаты страхавых плацяжоў па акладному страхаваньню.

Сёлета гэтых ільгот мяркуецца прадставіць вышэйпералічаным групам насельніцтва на 636.278 руб. Па акругах гэта сума разьмяркоўваецца наступным чынам: Аршаншчыне—71518 руб., Бабруйшчыне—10[illegible] руб., Віцебшчыне—64[illegible]04 руб., Гомельшчыне—76506 руб., Магілеўшчыне—109925 р., Мазыршчыне—44752 руб., Меншчыне—117452 р. і Полаччыне—41760 р.

Трэба адзначыць, што кампанія па збору страхавых плацяжоў у бягучым гаспадарчым годзе распачалася і прайшла са спазьненьнем, і патрабаваліся самыя рашучыя меры, каб разьвіць больш шпаркае паступленьне страхавых плацяжоў.

У чым-жа былі недахопы ў правядзеньні мінулай кампаніі?

Адным з асноўных недахопаў правядзеньня страхавой кампаніі бягучага гаспадарчага году зьявілася сыстэматычнае спазьненьне ўсіх работ, а таму мы і назіралі, што ў той час, як па сельска-гаспадарчаму падатку была ўжо сабрана досыць значная сума, дык па страхавых плацяжох пачалі паступаць толькі першыя ўзносы.

За посьпех акладной кампаніі павінны несьці адказнасьць нашы нізавыя савецкія органы. Калі ў папярэднія гады райвыканкомы і сельсаветы актыўнай ролі ў страхавых кампаніях не адыгрывалі, калі ў мінулай акладной кампаніі яны маглі яшчэ спасылацца на навізну работы, тлумачыць недахопы ў правядзеньні кампаніі наведаньнем справы, дык у падыходзячай кампаніі гэтыя прычыны ўжо адпалі, і сельсаветы з райвыканкомамі павінны будуць распачаць акладную страхавую кампанію своечасова і не дапускаць леташніх памылак.

Нашым сельсаветам і райвыканкомам неабходна падумаць аб тым, каб ільготны фонд быў своечасова разьмяркован і неабходна зрабіць так, каб кожны селянін загадзя ведаў, колькі яго гаспадарцы належыць страхавых плацяжоў. Зразумела, што ўся работа па падрыхтоўцы і правядзеньню акладной кампаніі ня будзе мець дастатковых вынікаў, калі да яе ня будуць прыцягнута ўся вясковая грамадзкасьць. Неабходна навакол акладной страхавой кампаніі завастрыць грамадзкую думку, увесь вясковы грамадзкі актыў трэба прыцягнуць [illegible] растлумачэньня м[illegible] Была на[illegible]ньня аб [illegible] растрату [illegible] вясковага акладнога страхаваньня. Неабходна паставіць справу так, каб кожны селянін ведаў, чаму з яго бяруць тую, а ня іншую суму. Трэба зрабіць так, каб кожны селянін добра ведаў, якую карысьць мае ад дзяржаўнага страхаваньня сялянская гаспадарка. Разам з гэтым нашым нізавым працаўнікам трэба памятаць, што кампанія 1927-28 году спазьнілася яшчэ і таму, што вельмі позна быў разьмяркованы ільготы сярод насельніцтва.

Нашы сельсаветы разам з сельскімі камітэтамі сялянскай узаемадапамогі павінны паставіць справу так, каб ільготы па акладному страхаваньню атрымалі толькі тыя гаспадаркі, для якіх яны прызначаны ўладай. Апрача таго, сельсаветы і райвыканкомы павінны паклапаціцца аб тым, каб ільготны фонд быў своечасова разьмяркованы—для ўнікненьня памылак мінулай кампаніі.

Райвыканкомы і сельсаветы павінны памятаць, што своечасовае разьмеркаваньне ільгот па акладному страхаваньню забясьпечвае своечасовы збор страхавых плацяжоў.

В. З—ў.

Сучасныя рабаўласьнікі*).

Ужо ў канцы знаходжаньня ў эміграцыйным доме перасяленцы пачынаюць адчуваць, што справа іх нядобрая, што там, на плянтацыях, іх чакае нешта грознае, нічога агульнага ня маючае са ўсім тым, аб чым так старанна гаварылі ў Эўропе. Але, калі яны, нарэшце, прыбываюць на месца свайго прызначэньня, калі яны на справе ўбачаць умовы жыцьця, работы і заработку, дык большасьць з іх праз кароткі тэрмін часу агортвае роспач: яны і ўдзень і ўночы праклінаюць той дзень, калі паслухалі здрадніцкіх парадаў вопытных агентаў-спакусьнікаў і адважыліся кінуць сваю бацькаўшчыну, паехалі за акіян шукаць «багацьця» і «шчасьця». А ўмовы працы на плянтацыях сапраўды «дасканалыя». Вось няхай нашы чытачы міркуюць самі.

Яшчэ ў эміграцыйным доме, пры падпісаньні канчатковага катракту, кожнаму рабочаму выдаюцца асобныя кніжкі з статутам працы на плянтацыях кавы ў Бразыліі. Гэтыя кніжкі, выдадзеныя на 3-х эўрапейскіх мовах—нямецкай, італьянскай і польскай,—зьяўляюцца верхам эзуітызму і няяснасьці, дзе наступны параграф ліквідуе папярэдні, дзе ўсё мае на мэце толькі заблытаць і ашукаць перасяленца, аддаўшы яго канчаткова ва ўладу наймальніка. Напрыклад, у адным з параграфаў гэтага „дасканалага" статуту гаворыцца, што рабочы ў «волным» ад збору кавы час павінен касіць сенажаці і рамантаваць шосы, належачыя плянтацыям.

Калі які-небудзь перасяленец пацікавіцца даведацца, якая велічыня гэтай сенажаці, ці якая даўжыня шосы, дык яму няясна адказваюць, што ўсё «глупства», ня варты і гутарак. Але «глупства» аказваецца далёка ня глупствам, а самай абураючай эксплёатацыяй незнаёмасьці перасяленца з мясцовымі ўмовамі. Пачаць хоць-бы з таго, што рабочы зьбірае каву зьдзельна, прычым, каб зарабіць сабе і сваёй сямейцы на жыцьцё, ён павінен і без таго працаваць ад золаку да золаку. Такім чынам, выходзіць, што ён павінен урваць ад сваёй працы ці «адпачынку час для таго, каб касіць сенажаці ці рамантаваць дарогі свайго гаспадара, а адным з параграфаў усё той-жа дасканалай па свайму шчыраму цынізму кніжцы гаворыцца, што наймальнік дае перасяленцу кватэру, якая, натуральна, разумеецца эмігрантам, як ужо гатовая. Але і тут, па прыезьдзе на плянтацыю, яго чакае вялікае расчараваньне, бо ніякага памяшканьня, прыгоднага для пражываньня, яму не прыгатавана. І вось ён сам, зноў-такі ў вольны ад працы час, павінен як-небудзь наладзіць сабе нешта накшталт бараку з старых дошчак, якіа яму дае гаспадар плянтацыі, прычым цэны гэтых дошчак, непамерна павялічаныя, будуць пастаўлены ў рахунак «доўгу» перасяленца. У такім „памяшканьні" летам стаіць страшэнная гарачыня, а калі ідзе дождж, дык эмігрант можа там зусім таксама, як пад адкрытым небам. Рабочаму на плянтацыях даваляецца мець для свайго ўжываньня розную хатнюю жывёлу, якую ён для разводу павінен таксама купляць зноў-такі толькі ў свайго гаспадара. Усе, у чым адчувае патрэбу рабочы (напрыклад, харчы, мэдыкаменты і інш.), ён павінен купляць толькі ў свайго гаспадара, які ставіць яму любыя цэны.

Цяпер паглядзім, якая-ж праца перасяленца, і які іх заработак на гэтых бразыльскіх плянтацыях кавы. Як я ўжо казаў, працуюць яны вьдзельна, прычым за прыблізна стокілёвы мех сабранае кавы гаспадар плоціць свайму рабочаму два рэпсы, што складае на нашыя грошы каля 50 кап. Усе прылады для збору кавы, як напрыклад, брэзэнт, які падкладваецца пад кававае дрэва ў сіта для прасейваньня кавы, драбіну і ўсё інш. перасяленец павінен мець уласнае, г. зн. зноў-такі набыць усё гэта ў крэдыт у свайго гаспадара. Калі нават меркаваць, што рабочы зьбірэ ў дзень 2 мяхі, г. зн. прыблізна 200 кілё кавы, што вельмі цяжка, дык і тое ён заробіць усяго адзін рубель у дзень. І гэта за 16-цігадзінны рабочы дзень пад гарачым паўднёвым сонцам і пад бізуном наглядчыка. Ці варта было з-за гэтага пераплываць акіян і пакідаць Эўропу?

Апрача таго, трэба яшчэ прыняць пад увагу, што клімат у Бразыліі, асабліва ўнутры краіны, зусім не падыходзіць для эўрапейца. Балотная трасца лютуе там, і шмат няшчасных людзей заўчасна памірае. Усё гэта прымушае перасяленца прапускаць даволі вялікую колькасьць рабочых дзён, што яшчэ больш зьмяншае і да таго бедны заработак рабочага, бо на плянтацыях у Бразыліі няма ніякіх страхкас, падобных, да нашых, якія аплачвалі-б рабочым у часе хваробы іх сярэдні заработак.

Даведзена, што эўрапеец, пры нармальным стане свайго здароўя (а хворых рабочых, наогул, у Бразылію не прапускаюць), ня можа вытрымаць больш васемнаццаці месяцаў гэтых барбарскіх умоў працы і жыцьця, а таму і сьмяротнасьць сярод гэтых няшчасных белых нявольнікаў у процантных адносінах вельмі вялікая. Але ўсё новыя і новыя партыі «жывога тавару» ідуць з Эўропы і з іншых частак зямной кулі на зьмену сваім загінуўшым у плянтатарскіх канцюрох таварышоў, усё новыя і новыя ахвяры кладзе на крывавы алтар капіталізму агідная арганізацыя сучасных рабаўласьнікаў.

Але надыходзіць, нарэшце, тэрмін кантракту, надыходзіць даўно з нецярпліваcьцю чаканы момант разьліку з гаспадаром плянтацыі. І вось, пры канчатковым падлічэньні, амаль заўсёды аказваецца, што, прымаючы пад увагу зрапушчаныя з прычыны хваробы дні, выдаткі гаспадара і эміграцыйнага дому па перавозцы эмігрантаў з Эўропы, яго ўтрыманьне і маленькі аванс, выдадзены яму пры падпісаньні кантракту, дошкі на барак, кошт харчоў, вопратка і рабочыя прылады—усё гэта складае такую вялікую суму, што няшчаснаму перасяленцу ня толькі нічога ад плянтатара не належыць, але ад яго яшчэ належыць гаспадару вялікая колькасьць даляраў, якія яму зноў прыходзіцца пачынаць аддаваць сваёй працай. Многія, асабліва спачатку, спрабуюць уцякаць з гэтага сучаснага пекла, але яны вельмі хутка на ўласных сьпінах пераконваюцца ў бескарысьлівасьці гэтых спроб. Акружаны неасяжным прасторам сваіх плянтацый, адмежаваных у большасьці выпадкаў ад усіх буйных цэнтраў, плянтатар распараджаецца лёсам сваіх вывезеных з іншых краін рабочых, як хоча, цынічна ўжываючы ў адносіне іх мэтады сярэднявяковых рабаўласьнікаў. Прыблізна ў цэнтры сваіх вялікіх плянтацый паўднёва-амэрыканскі эксплёататар ставіць асобыя варты, на вяршыне якіх ставіцца звычайна чорнакожы ўзброены стралок; гэты апошні наглядае за ўсімі дарогамі, якія вядуць да плянтацый яго гаспадара.

Калі вартаўнік заўважыць каго-небудзь з эмігрантаў, уцякаючага в райёну плянтацыі, ён зараз-жа дае ўмоўны сыгнал, які падымае на ногі цэлую зграю наглядальнікаў. І вось пачынаецца мэтадычна арганізаванае цкаваньне няшчаснага перасяленца, цкаваньне, якое па сваіх кашмарных дэталях можна параўнаць з самым цёмным часам амэрыканскай эпохі афіцыйнага рабаўласьніцтва. Цэлая зграя спэцыяльна вымуштраваных для гэтага паліцэйскіх сабак выпушчаецца ў пагоню за эмігрантам, які вельмі хутка зноў пападае ў лапы свайго гаспадара, азнаёміўшыся папярэдне на сваёй сьпіне з клыкамі паліцэйскіх сабак і з нагайкай наглядальніка. А што пакараньне за такую спробу ўцячы з плянтацый павінна быць ня з лёгкіх, ужо відаць з таго, што за значна меншы «ўчынак», як, напрыклад, зрываньне без дазволу з дрэваў апэльсінаў для таго толькі, каб прагнаць смагу ў часе працы, за такое, здавалася-б, нязначнае парушэньне «правіл» нагайка плянтатара або наглядальніка моцна гуляе па сьпіне вінаватага перасяленца.

Беліна-Падгаецк

Будаўніцтва Унівэрсытэцкага Гарадка ідзе здавальняюча.

(З гутаркі з прафэсарам Келдышам).

Кесоннае перакрыцьце экаманічна выгаднае.

Некаторыя з таварышоў падымалі пытаньне аб тым, што кесоннае перакрыцьцё на будаўніцтве Унівэрсытэцкага Гарадка зьяўляецца экаманічна невыгадным.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам праф. Келдыш опацыяліст па кесонных перакрыцьцях, адзначыў, што кесоннае перакрыцьцё роўнакоштна бэлячнаму.

— Треба мець на ўвазе,—кажа прафэсар Келдыш,—што ў сучасны момант вельмі цяжка і нават немагчыма атрымаць добрых бэльі, а таму треба лічыць кесоннае перакрыцьцё найбольш мэтазгодным. Апрача таго, кесоннае перакрыцьцё мае шмат перавагу перад бэлячным і з чыста эстэтычнага боку. Кесонныя перакрыцьці лёгка паддаюцца мастацкай апрацоўцы, што тансама зьяўляецца вельмі каштоўным. Гэта, зразумела, магчыма і пры бэлячным перакрыцьці, але пры апошнім патрэбны будуць ужо штучныя спосабы для мастацкай апрацоўкі, што ўздражае канструкцыю, а разам з тым і само будаўніцтва.

Прафэсар Келдыш адзначыў таксама, што некаторыя перакрыцьці на будаўніцтве Унівэрсытэцкага Гарадка нават нельга было-б выканаць бэлечным спосабам з прычыны немагчымасьцьці атрымаць вялікі адпаведнай даўжыні і профілю.

Моцнасьць перакрыцьцяў правільная.

Кесонныя перакрыцьці разьлічаны па існуючых нормах і маюць законны запас моцнасьці. Наогул, лепшых запасаў моцнасьці ні ў якім разе нельга было-б дапусьціць. Па думцы прафэсара Келдыша колькасьць моцнасьці жалеза бэтоннай канструкцыі наогул і ў прыватнасьці, кесонных, якія прымяняюцца на будаўніцтве Унівэрсытэцкага Гарадка, зьяўляюцца нармальнымі і правільнымі.

— Ня будзе лішнім адзначыць—кажа праф. Келдыш,—што выконваемая заграніцай, к прыкладу ў Нямеччыне, канструкцыя кесонных перакрыцьняў мае большы запас моцнасьці, чым у нас. Треба мець нішчэ на ўвазе больш высокую якасьць загранічнага жалеза, цэменту і інш. матар'ялаў, а таксама і якасьць выканньня работ. Да прыкладу—цэмант Нямеччыны прыблізна ў 2 разы мацней за наш, такі-ж самы малюнак і з іншымі загранічнымі матар'ялямі. Таніх чынам, думка некаторых працаўнікоў, што на будаўніцтве Унівэрсытэцкага Гарадка робяцца лішнія запасы моцнасьці зьяўляецца напраўільнай.

Кесонныя перакрыцьці зьяўляюцца адным з найбольш складаных канструкцый. З прычыны гэтай складанасьці і некаторага недахопу ў моцновых умовах высока-кваліфікаванай рабочай сілы, зусім зразумела, што тэмп будаўнічых работ на пабудоўцы Унівэрсытэцкага Гарадка некалькі марудны. Якасьць ма будаўніцтва, наогул, здавальняючая.

Будаўніцтва можна скончаць у тэрмін.

У заключэньне праф. Келдыш адзначыў, што на будаўніцтве Унівэрсытэцкага Гарадка ёсьць шырокае поле для разьвіцьця работ, але таго амыўленьня, якое магло-б быць на гэтым будаўніцтве, ня відаць.

Праф. Келдыш лічыць, што боль усе магчымасьці для таго, каб окончыць будаўніцтва Унівэрсытэцкага Гарадка ў вызначаны тэрмін (да 1 студзеня 1930 г.), зразумела, калі ў далейшым будуць прыняты ўсе меры да паскораньня будаўнічых работ.

В.

Самаабкладаньне---на дабрабыт вёскі.

Каб ведалі, на больш правялі-б.

Такая думка зараз маецца ў беднякоў і рядняноў—сялян Бабруйскага сельсавету. Пытаньне, хіба-ж ня было зусім самаабкладаньня?

Не было, ды толькі 1-шы год яно прайшло з пяжнасьцю на 15 проц. ад выплаты сельска-гаспадарчага падатку, а то зусім на 10 проц. Сялянства перш недавершыва адносілася да гэтай справы—думалі, што пошы выбіраюць і ўсё,—ан вышла надвадвоі. Па ўсяму нашаму сельсавету самаабкладаньня нялічана грашыма 860 руб. 7 кап., працай 430 руб., спагнана грашыма 784 р. 22 кап., працай выканана на 90 руб. На гэтыя грошы АДРАМАНТАВАНА ШКОЛА, ЗРОБЛЕНА 10 ДЗІЦЯЧЫХ ЛАВАК і інш. На ўсё расходавана грошай 175 р. 30 кап. НА ЗДАБЫЦЬЦЁ ПАЖАРНЫЯ МАШЫНЫ АДПУШЧАНА 154 РУБ., ЗРОБЛЕНЫ ВІРКІ, ВЁДРЫ, ПАВОЗКА ЛІНЕЙКА, БАГРЫ І ІНШ.

АДРАМАНТАВАНЫ ДЗЬВЕ ДАРОГІ І ЗРОБЛЕНЫ ТРЫ МАСТЫ НОВЫЯ З ІХ ДВА РАЙЁННАГА ЗНАЧЭНЬНЯ. На гэта патрачана 114 р. 28 к. Зараз расходуюцца аотатнія грошы на рамонт дому пад школу, але гэта пытаньне будзе сельсавет отавіць на сходзе сялян. Наогул, самаабкладаньне нялічана грашыма 860 руб. 7 кап., працай 430 руб., спагнана грашыма 784 р. 22 кап., працай выканана на 90 руб. На гэтыя грошы АДРАМАНТАВАНА ШКОЛА, ЗРОБЛЕНА 10 ДЗІЦЯЧЫХ ЛАВАК і інш. На ўсё расходавана грошай 175 р. 30 кап. НА ЗДАБЫЦЬЦЁ ПАЖАРНЫЯ МАШЫНЫ АДПУШЧАНА 154 РУБ., ЗРОБЛЕНЫ ВІРКІ, ВЁДРЫ, ПАВОЗКА ЛІНЕЙКА, БАГРЫ І ІНШ.

АДРАМАНТАВАНЫ ДЗЬВЕ ДАРОГІ І ЗРОБЛЕНЫ ТРЫ МАСТЫ НОВЫЯ З ІХ ДВА РАЙЁННАГА ЗНАЧЭНЬНЯ. На гэта патрачана 114 р. 28 к. Зараз расходуюцца аотатнія грошы на рамонт дому пад школу, але гэта пытаньне будзе сельсавет отавіць на сходзе сялян. Наогул, самаабкладаньне нялічана грашыма 860 руб. 7 кап., працай 430 руб., спагнана грашыма 784 р. 22 кап., працай выканана на 90 руб. На гэтыя грошы АДРАМАНТАВАНА ШКОЛА, ЗРОБЛЕНА 10 ДЗІЦЯЧЫХ ЛАВАК і інш. На ўсё расходавана грошай

СЯЛЯНЕ КАЖУЦЬ: «ТРЭБА БЫЛО-Б БОЛЬШ ПРАВЕСЬЦІ; САМААБКЛАДАНЬНЕ, ДЫК ЛЕПШ НАМ БЫЛО-Б.

Вясной АНДРЭЙ БАБОЎСКІ

Добра скарыстоўваюць.

Сродкі, сабраныя за самаабкладаньне, усе чыста пайшлі на тыя патрэбы, якія пастанавіла насельніцтва.

У вёсцы Галіцы, А.-Гар. с.-с. купілі пажарную машыну, пабудавалі ватары масты і выбрукавалі вуліцу.

У м-ку Астр.-Гарадку адрамантавана дзьня, на якую пайшло каля 1500 р. Будуецца пажарнае дэпо каштоўнасьцю каля 4000 руб. Аднак сустракаюцца выпадкі перарасходаваньня грошай, напр., за вывазку дрэва на пабудову дэпо заплачана 225 руб. у той час, калі другія сяляне прасілі за вывазку 175—200 руб.

Х. Б.

М-ка Астр.-Гарадок, Меншчына.

Школа рамантуецца, і дарогі нішто.

Наш сельсавет зьяўляецца адным з найбагатных сельсаветаў раёну. Самаабкладаньне спаткала тут вялікія цяжкасьці, але, дзякуючы ўпартай працы прадстаўніка раёну і сельсавету разам з вясковым актывам, яго ўдалося правесьці на 35 проц. У кожнай грамадзкай вёсцы самаабкладаньне праводзілася на розныя патрэбы. Возьмем, к прыклад, вёску Крупіцу. Дарогі ў ёй былі такія, што сяляне памалі калёс, ногі коням і г. д. Цяпер, працуючы, можна бачыць зусім іншае. Добрая дарогі выкапаны канаўкі, зроблена грэбля, адрамантаваны масты. На рамонт школы з усяго школьнага раёну ў гэтай-жа вёсцы сабрана больш 2000 руб. 30 проц. самаабкладаньня вёсак, якія ўваходзяць у абслугоўваемы Дуб.-Слабадзкой школай раён, пойдуць таксама на рамонт яе. Рамонт пачаўся ў замінулым годзе, але ня скончан і працягваецца ў гэтым годзе. Незадаволеныя ў часе правядзеньня самаабкладаньня сяляне, ня верыўшы, што грошы пойдуць на мясцовыя патрэбы, цяпер кажуць: «яно сабе і добра, глядзі, як рамантуюцца школы, ды і дарогі нішто».

А. К.

Самахвалавічы, Меншчына.

Сродкі ляжаць, а будынак гніе...

Пра самаабкладаньне.

На нашаму Глыбачанскаму с.-с. добра была праведзена работа на налічэньні проц. самаабкладаньня, але гэта толькі па налічэньні. Амаль ва ўсіх вёсках налічана 35 проц., але зусім ніводна абстаіць справа са зборам гэтых сродкаў. Налічэньне асталося на паперы. Вясной гэтага году с.-с. трохі сабраў сродкаў, але на гэтым справа і скончылася. Другі год стаіць без даху і гніе сьвіран, які мерывалі скарыстаць як агульнае памяшканьне пад с.-с., хату-чытальню і кантору. Калі перавозілі гэты сьвіран з Гарбаціцкага с.-с. у Глыбачанскі, то быў дах. Цяпер даху няма, яго с.-с. сумесна з пазычковым т-м прадалі аднаму гр-ну з вёскі Глыбочна Гіндзіну Нахману. Бярвеньне валяецца, поўная безгаспадарчасьць. Пакуль гэта памяшканьне накрыюць чарапіцай, дык яно зусім згніе і крыць нечага будзе. Няўжо гэта так і патрэбна? Сяляне кажуць—закон добры, але яго не праводзяць у жыцьцё. Райвыканком таксама не зварачвае на гэта ніякай увагі. Трэба каму-небудзь звярнуць на гэта ўвагу. Трэба расшавяліць нашых гаспадароў, а то яны зусім заснулі.

Селянін.

Вульскі р., Полаччына.

НА БАРАЦЬБУ З БЯСПРЫТУЛЬНАСЬЦЮ.

Ніводнага бяспрытульнага на вуліцы!

У гутарцы з нашым супрацоўнікам намесьнік адказнага сэкратара Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі т. Таўбэ спынілася на значэньні месячніка па барацьбе з бяспрытульнасьцю.

— Сёньня,—зазначыла т. Таўбэ,—у БССР распачынаецца месячнік барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю і бездагляднасьцю. Гэта кампанія мае на ўвазе ня толькі папоўніць нашы



Бяспрытульныя дзеці ў ачагу.

матар'яльныя рэсурсы, але і ўцягнуць у справу аздараўленьня нашае грамады, аздараўленьня шэрагаў будучых барацьбітаў за новае жыцьцё. Мы ня можам і не павінны спакойна глядзець, як на вуліцах туляюцца абшарпаныя, брудныя, голыя, галодныя, маральна сапсаваных дзеці. Трэба мабілізаваць усю грамадзкую думку, усю актыўнасьць працоўных мас на барацьбу в гэтай спадчынай агіднага мінулага. Кожнае дзіцё, вырванае з кіпцяў вуліцы, кожны бяспрытульны, вымешчаны ў нармальныя ўмовы выхаваньня, зьяўляецца актам вялізарнага маральнага значэньня. Ад нас саміх зараз залежыць аздараўленьне нашай грамады, ачыстка яе ад рознага праступнага элементу, які ў асобе дзяцей вуліцы зьяўляецца спрыяючай глебай для распладжваньня тысячаў злачынстваў, бандытаў, прастытутак і інш. адхіляў чалавечага роду.

Вельмі рэдка хто думае аб тым, што бяспрытульны дзяцюк, які зараз в плаксівай мінай прафэсыянала працягнае руку, з часам заб'е ці абрабуе вас. Мала хто з нас думае аб гэтым, і мы з нецярплівасьцю імкнёмся адкараскацца ад настойлівае назолы.

Вось чаму ў месячнік барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю мы павінны ясна паставіць перад намі пытаньне: ці пакінуць усё па-стараму—гэта значыць пакінуць на вей-вецер дзяцей вуліцы, даючы ўсе магчымасьці для разьвіцьця ўсіх відаў праступленьняў, ці аздаравіць нашу грамаду, вырываючы ў пачатку храстві разбэшчанасьці і сапсутасьці.

Памятаючы гэта, працоўныя масы БССР павінны стаць членамі т-ва „Прыхільнік дзяцей". Што значыць для БССР 300 тысяч т-ва «Прыхільнік дзяцей»? Гэта кропля ў моры, гэта незначная частка таго, што мы можам зрабіць. Пытаньне барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю павінна стаць неадкладным абавязкам кожнага рабочага, селяніна, служачага. Гэта павінна быць грамадзкім абавязкам кожнага сьвядомага чалавека.

У працягу гэтага месячніка мы павінны праверыць, як жывецца дзецям у дзіцячых дамох. Самі працоўныя масы павінны блізка падыйсьці да тысячаў дзяцей, якія ня маюць магчымасьці расьці сярод сямейных абставін; у гэтай справе павінны прыняць чынны ўдзел жанаддзелы, гарсаветы, прафсаюзы, камсамол.

Усе рабочыя арганізацыі ў асобе прафсаюзаў павінны актыўна працаваць у гэту кампанію: усе мясцовы павінны склікаць спэцыяльныя сходы па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю; усе рабочыя клюбы павінны ладзіць розныя пастаноўкі на карысьць бяспрытульных.

Наогул у працягу месячніка трэба дабіцца поўнай ліквідацыі вулічнай бяспрытульнасьці, абхапіць і ўцягнуць бездаглядных дзяцей у арганізаваную культурна-асьветную працу праз клюбы і г. д.

Барацьба з дзіцячай бяспрытульнасьцю і бездагляднасьцю не павінна абмежавацца толькі горадам. Вёска таксама патрабуе гэтай дапамогі, бо там таксама ёсьць шмат бяспрытульных і бездаглядных. Трэба разварушыць вясковы актыў, уцягнуўшы яго ў гэту кампанію.

Барацьба з бяспрытульнасьцю залежыць ад нас саміх. Ад нас саміх залежыць вынішчыць гэта зло.

Дык усе—у шэрагі т-ва «Прыхільнік дзяцей».

К. І.

Дапамога дзецям матак-адзіночак.

Сёньня распачынецца месячнік барацьбы з бяспрытульнасьцю. У гэты месяц прыцягваецца ўвага працоўных мас да адной з вялікіх задач, якія стаяць перад савецкімі органамі і савецкай грамадзкасьцю—вынішчэньня бяспрытульнасьці.

Задача камісіі па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю складаецца ня толькі з таго, каб забраць бяспрытульных дзяцей з вуліцы—яна ідзе далей: яна папярэджае бяспрытульнасьць. Вось чаму камісія дапамогі дзецям матар'яльна падтрымлівае дзіця, пачынаючы з першых дзён яго жыцьця, калі яго матка-адзіночка ня мае сродкаў для існаваньня.

Беспрацоўе, наўскоўлівасьць сямейных адносін, існуючая яшчэ экаманічная залежнасьць сям'і ад мужа—патрабуе дапамогі жанчыне, як матцы; якая часта застаецца бяз сродкаў і ня мае магчымасьці выхаваць сваё дзіця.

На падмогу гэтаму кадру жанчын прыходзяць органы аховы здароўя праз Саветы Сацыяльнай Дапамогі.

Асноўным відам дапамогі зьяўляюцца яслі, бо толькі яны даюць матцы магчымасьць, вызваляючы яе, знайсьці працу. Толькі дзякуючы яслям зьявілася магчымасьць выкарыстаць працу матак-адзіночак на грамадзкіх работах, у працкалектывах і на падзённай працы, якую яны самі сабе знаходзяць.

На сродкі, адпушчаныя камісіямі дапамогі дзецям, ёсьць яслі выключна для дзяцей матак-адзіночак: у Менску —на 120 чал., у Віцебску—на 45 чал., у Бабруйску—на 25 чал., у Магілеве—на 15 чал., у Барысаве—на 10 чал., у Воршы—на 5 чал., у Мазыры—на 5 чал., у Гомлі—на 5 чал., а ўсяго па БССР на 230 дзяцей.

Адным з выглядаў дапамогі зьяўляецца арганізацыя працоўных майстэрняў, праца ў якіх магчыма пры наяўнасьці ясляў; такія майстэрні—пашывачная і па лазаньні мяшкоў існуюць у Менску на 35 чалавек.

Абедаюць.

Пры дапамозе органаў аховы здароўя ўдалося частку матак-адзіночак паслаць на сталую і часовую працу. Напрыклад, за 1927 г. паслана на сталую працу 35 чал., на часовую—100 чал.

На сродкі камісіі дапамогі дзецям выдаецца штомесяц 150 пайкоў маткам прадуктамі, адзеньнем, гарачымі абедамі ці грашыма. З малочных кухняў пры дзіцячых кансультацыях выдаецца дзецям матак-адзіночак бясплатна малако.

Адным са спосабаў барацьбы в дзіцячай бяспрытульнасьцю зьяўляецца патранат (аддаваньне дзяцей у сем'і рабочых і служачых на выхаваньне). За апошні год па БССР аддана на выхаваньне 140 дзяцей, з іх частка на сродкі камісіі дапамогі дзецям.

З году ў год павялічваюцца асыгнаваньні, якія выдаюць камісіі дапамогі дзецям на барацьбу з бяспрытульнасьцю па лініі аховы здароўя. Так, у 26-27 г. ЦК Дапамогі дзецям на гэту патрэбу выдавалася 27.000 руб., а ў 27-28 г. выдаецца амаль у два разы—каля 52.000 руб.

Шмат што, але яшчэ больш, застаецца зрабіць. Наша задача—у працягу бліжэйшых гадоў вынішчыць у корані бяспрытульнасьць, а гэта немагчыма бяз удзелу шырокіх працоўных мас.

Граеўская.

БАРАЦЬБА З БЯСПРЫТУЛЬНАСЬЦЮ Ў МЕНШЧЫНЕ.

Чаму Менск зьяўляецца галоўным асяродкам бяспрытульнасьці.

Каля году таму назад у Менску і ў бліжэйшых яго раёнах знаходзілася звыш 800 бяспрытульных і бездагляднных дзяцей. Галоўная прычына прыпыніку ў Менску значных груп бяспрытульных дзяцей тлумачыцца тым, што Менск знаходзіцца на сутыку ліній найбольшага руху бяспрытульных. Вельмі частыя выпадкі, калі дзеці, маючы намер паехаць на бацькаўшчыну за кардон, прымушаны застацца ў Менску. Гэта таксама павялічвае лік бяспрытульных, бо яны застаюцца на ўтрыманьні мясцовых органоў.

Патрэбны сродкі.

Дзеля палепшаньня матар'яльнага становішча Менскага акруговага т-ва па барацьбе з бяспрытульнасьцю прышлося ў першую чаргу прыняць усе меры ў напрамку здабываньня сродкаў. Сродкі складаюцца з сяброўскіх узносаў па т-ву «Прыхільнік дзяцей», але сродкі гэтыя вельмі незначныя і далёка невыстарчальныя. У сувязі з гэтым былі прыняты крокі да ўстанаўленьня больш-менш сталай крыніцы прыбыткаў. Дзеля гэтага быў прыняты летась ад Чырвонага Крыжу яго універсальны магазын па Савецкай вуліцы, які дае пэўны прыбытак. Апроч гэтага, эксплётаваўся цырк.

У выніку цэлага шэрагу мерапрыёмстваў за мінулы год з (чэрвеня 1927 году за мая 1928 г.) акруговае т-ва атрымала 18.598 р. прыбытку.

Колькі дзяцей упарадкавана.

За гэты час з вуліц падабраны і накіраваны ў Інстытут Сацыяльнага Перавахаваньня — 35 бяспрытульных дзяцей; у прафшколы, тэхнікумы, дзіцячыя дамы—92; на розныя курсы—17; у якасьці броні—35; на працу—46. Апроч гэтага, штомесяц выдаецца ад 3-х да 7 з паловай руб. 175 дзецям. На летні час арганізаваны 2 дзіцячыя пляцоўкі; з лістапада мінулага году адчынен ачаг на 40 бяспрытульных дзяцей. У ясьлях Менску 10 месц забраніравана за акруговым т-вам.

Месцам канцэнтрацыі бяспрытульных і бездагляднных дзяцей зьяўляецца клюб-сталоўка, якая адчынена ў лістападзе м. г. Зараз у сталоўцы выдаецца 160 абедаў і гэтулькі-ж порцый вячэры.

Бяспрытульных у сучасны момант ёсьць больш 20, якія ўжо пасьпелі пабываць ва ўсіх гарадох Саюзу і па некалькі разоў у Інстытуце Сацыяльнага Перавахаваньня.

За апошні час упарадкавана: паслана для навучаньня на бляхароў—11 падросткай, 5—у музыкантскія каманды і 10 хлапцоў пакінуты пры шавецкай майстэрні, якая знаходзіцца пры сталоўцы.

Для бяспрытульных адчынена начлежны дом на 20 чалавек. Каб даць магчымасьць працаваць бяспрытульным дзецям і, такім чынам, вырваць іх з кіпцяў вуліцы, адчынена майстэрня люстэрак.

На розныя мерапрыёмствы за мінулы год было выдадзена 21.403 р.

АДЗІНЫМ ФРОНТАМ.

Набліжаецца новы вучэбны год, які перад школай і настаўніцтвам ставіць новыя задачы: паглыбленьне ведаў, сувязь з вытворчасьцю і насельніцтвам, узмацненьне выхаваўчай працы, выпрацоўка элемэнтаў новага быту і г. д.

Каб выканаць гэтыя задачы, як яны ставяцца перад школай сёньня, патрэбен вопыт, энэргія, настойлівасьць і дружная праца ўсяго настаўніцкага калектыву, органаў вучнёўскага самакіраваньня, піанэрпрацаўнікоў.

На вялікі жаль, такі кантакт у шматкамплектных школах сустракаецца, як рэдкае і шчасьлівае здарэньне. А го: піанэрпрацаўнікі вядуць сваю працу (часта бяз усякага плану), настаўнікі—сваю, часамі раўналежна, адну і тую-ж і ўзгодненасьці няма, няма абмену думкамі, назіраньнямі. Дый ці можна рэзка падзяліць так працу? Гэта-ж шкадліва для вучняў. Праца піанэрпрацаўнікоў і праца настаўнікаў—гэта паасобныя бакі адпае і тае-ж выхаваўчае працы.

Працуюць у школах партыйныя настаўнікі. Іх роля вельмі адказная. Яны павінны быць праваднікамі партыйнае лініі ў абставінах працы данае школы, чутка і ўважліва яны павінны папярэджваць магчымыя памылкі з боку паасобных настаўнікаў, павінны быць блізкімі таварышамі, прынімаць актыўны ўдзел у школьнай і пазашкольнай працы. А ў сапраўднасьці мы часамі назіраем вельмі фармальныя адносіны да гэтых абавязкаў, назіраецца некаторая адарванасьць ад масы.

Прывітаньні—ёсьць адзнака блізкасьці людзей. А некаторыя нават ня лічаць сваім абавязкам адказваць на прывітаньні настаўнікаў свае-ж школы. Хіба можа гэта ёсьць адзнака буржуазнасьці? Парт'ячэйкі працаўнікоў асьветы павінны зьвярнуць належную ўвагу на выхаваўчую працу асьветнікаў і асабліва партыйных таварышоў. Трэба праводзіць практычную працу кожнаму на сваім месцы, набліжаць і зьвязваць настаўніцкія масы з партыяй, без чаго настаўнік ня можа быць настаўнікам у сучаснай школе ў пэўным сэнсе гэтага слова.

Наглядаецца нейкі разлад паміж старымі настаўнікамі і новымі. Гэта часамі адчуваецца вельмі востра. У маладых выяўляецца часта (не ва ўсіх) залішняя саманадзейнасьць і непрактычнасьць, перавялічаная ацэнка сваёй працы, раскіданасьць у працы. Старыя настаўнікі ня зусім уважліва падыходзяць часамі да першых няўдач новага настаўніка, забываюць свае памылкі ў першыя гады, досыць строга і залішне крытычна распоньваюць першыя вопыты практычнае працы. У выніку—шэраг непаразуменьняў.

Вучэбныя ўстановы, якія выпускаюць новыя кадры настаўнікаў, павінны належным чынам падрыхтоўваць іх (настаўнікаў) да працы ў калектыве, да належнае ацэнкі свае і чужое працы. Старым настаўнікам неабходна на першых кроках аказваць належную дапамогу сваім малодшым таварышам.

У нас яшчэ вельмі мала таварыскай узаемадапамогі. Мала калектыўнай творчасьці. Шмат несяброўскага, начальніцкага. Радавыя працаўнікі баяцца сьмела падаць свой голас, паказаць на чужыя памылкі ці недахопы. У выхаваўчай працы гэта шкадліва.

Волін.

Напярэдадні асеньняй сяўбы.

Крэдыты на сяўбу.

Крэдыты павінны быць скарыстаны па свайму прызначэньню.—Пры разьмеркаваньні крэдыту цьвёрда трымацца клясавай лініі.

У надыходзячую асеньнюю сяўбу галоўная ўвага павінна быць зьвернута на пашырэньне засеўнага кліну, павялічэньне ўраджайнасьці з лепшай апрацоўкай зямлі і садзейнічаньне разьвіцьцю і ўзмацненьню калектыўных сялянскіх гаспадарак.

Правядзеньне ўсіх гэтых мерапрыёмстваў у часе асеньняй сяўбы значна залежыць ад наяўнага сродкаў, якія дзяржава дае сялянству (асабліва беднаце) шляхам сельска-гаспадарчага крэдыту. Тут асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на тое, каб у часе асеньняй сяўбы забясьпечыць беднату і калгасы крэдытамі на набыцьцё с.-г. машын, насеньня, мінэральнага ўгнаеньня і інш.

Белсельбанк усе гэтыя мерапрыёмствы своечасова прыняў пад увагу і выпрацаваў канкрэтныя меры да забясьпечаньня крэдытамі на асеньнюю сяўбу.

На асеньнюю сяўбу адпушчана 425 т. руб. крэдыту і гэта сума разьмеркаваў так: на насеньне—150 т. руб., на штучнае ўгнаеньне—150 т. руб. і на набыцьцё с.-г. машын—125 т. руб.

Апроч гэтага, для крэдытаваньня выключна калектыўных гаспадарак адпушчана 300 т. руб. і для бядняцкіх гаспадарак з фонду беднаты—120 т. р.

Акрамя пералічаных сум, па лініі Белсельбанку дадаткова адпушчана 500 т. руб. на сельска-гасп. машыны і 200 т. руб. на кантрактацыю засеваў жыта.

Разам з засевам азімага кліну сёлета прадугледжана закладзі шэраг групавых садоў, пераважна ў калектыўных гаспадарках і пасёлках. На гэта мерапрыёмства ўжо адпушчана і разьмеркавана па акругах 60 тыс. руб. крэдыту.

Крэдыт для закладкі групавых садоў (набыцьцё пладовых саджанцаў) будзе выдаваецца тэрмінам на 5 год.

Як відаць, дзяржава адпушчае вялікія крэдыты на ўзмацненьне сялянскіх гаспадарак і, наогул, падняцьце с.-гаспадаркі.

Грошы адпушчаныя, але на гэтым працу спыніць нельга. Галоўная праца яшчэ наперадзе, бо адпушчаныя сродкі трэба разьмеркаваць непасрэдна на месцы і даць іх таму, каму крэдыты вызначаны.

Гэта павінны прыняць пад увагу райвыканкомы і ўся нізавая крэдытная сетка і цьвёрда трымацца клясавай лініі пры разьмеркаваньні крэдытаў, накіроўваючы іх на ўзмацненьне і падняцьце калектыўных і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Распачалі працу.

Сельгаспадарчае крэдытнае таварыства распачало працу па падрыхтоўцы да асеньняй пасеўнай кампаніі.

Сялянству прададзена 2000 пудоў мінэральнага ўгнаеньня. Мяркуецца завезьці яшчэ 8000 пудоў. Трэба зазначыць, што з боку сялянства ў гэтым годзе маецца вялікі спрос на ўгнаеньне.

Па райёну праведзена кантрактацыя 200 гэктараў жыта.

Сельгаспадарчымі машынамі таварыства забясьпечана поўнасьцю.

Х. Б.

М-ка Астр.-Гарадок, Меншчына.

Гомельшчына рыхтуецца.

Ужо праведзена падрыхтоўка да асеньняй пасяўной кампаніі. З 20.400 пуд. гатунковага жыта, намечаных па пляну, пад загадам акрземаддзелу маецца цяпер 7.500 пуд., якія перакідаюцца на месцы;

Зернаачышчальныя абозы прыведзены ў парадак і ў акрузе будзе адгатунована 153 тыс. пуд. зярна, Арганізуецца дапамога бядняцкім гаспадаркам у абмалоце зярна. Для гэтага прыцягваюцца савецкія гаспадаркі, калектыўныя гаспадаркі і машынныя таварыствы.

У мінэральных угнаеньнях недахопу адчувацца ня будзе.

В.

Савгасы сьпяшаюцца.

Магілеў, 13-8. Савецкія гаспадаркі прыступілі да сьпешнага абмалоту азімых культур. Сёлета савгасы павінны абмяняць сялянству 360 тонн гатунковага збожжа. Абмен пачынаецца з 20 жніўня.

Гатунковае насеньне сялянству.

Бабруйск, 13-8. *Савгасамі Бабруйшчыны для прадажы і абмену з насельніцтвам вёскі да вясеньняй сяўбы будзе вылучана 30000 пудоў гатунковага збожжа.*

Культурна-гаспадарчы рост Палесься.

Палеская частка раёну складаецца з 7 сельсаветаў, з якіх 3 знаходзяцца далёка ад цэнтру і 4 на адлегласьці 15-25 кілёмэтраў.

Да рэвалюцыі насельніцтва Палесьсяжыло надта бедна і было вельмі некультурна. Так, напрыклад, ва ўсім Палесьсі меліся толькі дзьве сельскія школы. 90 проц. дзяцей школьнага росту заставаліся без усякай навукі. Дрэнныя і вельмі далёкія былі шляхі зносін. Да бліжэйшага мястэчка (Старобін—Жыткавічы) 65 кілёмэтраў, а бліжэйшага гораду (Слуцак—Мазыр) 100-140 кілёмэтраў.

Словам, куды ні кінь, дык паляшук з самай неабходнай патрэбай павінен ехаць 2 сутак, ці плаціць у тры разы даражэй вандруючаму спэкулянту.

Культуру на Палесьсі замянялі мановолькі, недахвату ў якіх не адчувалася.

Глеба на Палесьсі дрэнная, балотнавая, ад гэтага ўраджай надта слабы. Свайго хлеба паляшук меў ня больш, як да каляд. Астатні час ён мусіраны быў купляць хлеб у палявой частцы—пад Слуцкам. Палявую частку паляшукі называлі Літвой.

Калі спытаеш, „куды ты, Пятрок, ідзеш", дык ён табе абавязкова адкажа: «у Літву, за хлебам».

А заможныя палявікі сьмяюцца—„прыедуць, кажуць, «Хаміцэвічы» і хлеб раскупяць, нідзе ня дзвенуцца. Заплоняць па тры рублі за пуд".

Мяняецца час—мяняюцца і людзі. Савецкая ўлада глыбока заглянула ў цэмру Палесься і зрабіла крокі да падняцьця культурнага ўзроўню паляшукоў.

Замест былых 2-х царкоўна-прыходзкіх школ на Палесьсі маецца: 2-х камплектных 7 школ, аднакампл. 12, хат-чытальняў — 2, мэдпунктаў—3, ветпунктаў—1, агранамічны вучастак—1, спажывецкіх таварыстваў 3, адно сельска-гаспадарчае таварыства і 2-е дзіцячых ясьляў.

„Хаміцэвічы" сталі гаспадарамі свайго становішча. А прозьвішча „Хаміцэвіч" больш не зьяўляецца насьмешкаю. Сёлета яны ўжо зьявіліся ў Старобінскай сямігодцы. Адрамантаваны і наладжаны і шляхі зносін на Палесьсі. Паляшукі рашуча ўзяліся за працу. Не чакаючы дапамогі дзяржавы, яны сваімі сіламі і сродкамі робяць усё магчымае. Паказваюць прыклад і палявой частцы.

Так, напрыклад, самаабкладаньне па ўсяму Палесьсю прынята на 35 проц. На сродкі самаабкладаньня будуецца 1 школа, заканчваецца пабудова больніцы і 2-х-камплектавай школы, заказаны 2 пажарныя машыны, рамантуюцца масты і школы.

Палявая частка ў гэтым напрамку зусім закульгала, 2 сельсаветы ад самаабкладаньня зусім адмовіліся. Ніякія мерапрыёмствы па палепшаньні быту не праводзяцца. Нават бягучай палітыкай мала займаюцца. Напрыклад, адным Палескім Князь-Азерскім сельсаветам выпісваецца больш літаратуры, як 4 сельсаветамі палявой часткі разам.

У спадчыну ад старога ладу засталася аж да гэтага часу вялікая п'янка паляшукоў і непатрэбнае вядзеньне розных судовых спрэчак, якія таксама канчаюцца п'янкай.

Партыйным і савецкім працаўнікам раёну трэба на гэта зьвярнуць асаблівую ўвагу і павесьці працу ў гэтым напрамку. Тады „Хаміцэвічы" на цалую галаву будуць вышэй.

Н. С. Г.

Старобінскі р.

Чым хварэюць агульна-адукацыйныя ўстановы для дарослых

Барысаўскі гарком КП(б)Б падагуліў працу агульна-адукацыйных устаноў для дарослых за мінулы навучальны год.

Усяго такіх устаноў па г. Барысаву маецца 24. З іх 1 школа павышанага тыпу, якая ахапляе 135 асоб. Адна школа рабочае моладзі ў Нова-Барысаве, якая працуе ў 2 зьмены, прыстасоўваючыся да ўмоў працы рабочай моладзі; адна вячэрняя школа рабочае моладзі ў г. Барысаве на яўрэйская мове; 3 школы для малапісьменных і 18 лікпунктаў. Усяго ва ўсе гэтыя ўстановы было ўцягнута 890 асоб, з якіх каля 70 проц. рабочых, 10 проц. сялян і чырвонаармейцаў.

Галоўная перашкода ў вядзеньні нармальных заняткаў у школах і лікпунктах—настаўніцкі склад і памяшканьні. Настаўнікі ў школах рабочае моладзі лічылі гэтую працу пабочным заработкам і займаліся так пасьля працы ў школах 7-хгодках. Відома, што гэта дрэнна адбівалася на працы. Кіраўнікі лікпунктаў у большасьці былі з надта слабой кваліфікацыяй, што прыводзіла да таго, што ў некаторых лікпунктах заставалася да канца заняткаў толькі адна чвэрта вучняў.

Уся навучальная сетка для дарослых ня мае сваіх уласных будынкаў і заняткі праводзяцца ў агульных школах пасьля таго, як там займаліся 2 зьмены вучняў 7-хгодак. Відома, што гэта не дае магчымасьці праветрыць памяшканьні, і слухачы, прапрацаваўшы 8 гадзін на прадпрыёмстве ў дрэнным паветры, яшчэ трапляюць у душныя клясы, што надта дрэнна адбіваецца на якасьці працы ў школах.

У школах наглядаецца значны адсеў. Так, з 516 вучняў у лікпунктах у працягу навучаньня адсеялася 166 чал., ці 32 проц., з школ рабочае моладзі выбыла 133 чал. і г. д. Прычыны гэтага вялікага адсеву часткова грунтуюцца ў агульных умовах працы школ, а часткова тлумачыцца тым, што вучняў школ прафсыянальныя, партыйныя і камсамольскія арганізацыі перагружаюць іншымі абавязкамі.

Усе гэтыя школы далёка не папулярны сярод шырокіх мас, што тлумачыцца тым, што ўсялякія спробы заладжыкаў школ паставіць даклад школы на рабочых сходах не падтрымліваюцца прафэсыянальнымі арганізацыямі, прычым яны адказваюць: «У нас больш важныя пытаньні маюцца».

Школы не вядуць ніякае працы па самаадукацыі сярод рабочых. А імкненьне да самаадукацыйнае працы вялікае.

Некалькі слоў аб мэтадах выкладаньня ў школах для дарослых. У леташнім навучальным годзе ўжываліся амаль

Сваечасовая дача ільгот насельніцтву па акладному дзяржаўнаму страхаванню забясьпечвае сваечасовы збор страхавых плацяжоў.

ТЭАТРАЛЬНЫЯ НАВІНЫ.

Што рыхтуе БДТІ.

БДТІ зараз рыхтуе да пастаноўкі новую п'есу Міровіча «Верацёны сьпяваюць»—з сучаснага жыцьця ткацкіх фабрык. Гэтай п'есай мяркуецца адчыненьне сёлетняга тэатральнага сэзону. Адначасна з гэтым праводзіцца праца па пастаноўцы «Бронецягнік». П'еса перапрацована нанава аўтарам і прыстасавана да беларускіх асаблівасьцяй з часоў грамадзянскай вайны; у аснову ўзята польская акупацыя. У сувязі з гэтым зараз праводзіцца вывучэньне партызаншчыны на Беларусі, дзеля набыцьця матар'ялаў для пастаноўкі гэтае п'есы. Падрыхтоўчую работу на пастаноўцы гэтай п'есы вядзе вядомы малады рэжысэр, асыстэнт вучань рэжысэра Таірава т. Сьмянаў. Афарміленьне гэтай п'есы даручана мастацкаму тэатру МГСПС (Маскоўскага гарадзкога савету прафесыянальных саюзаў), а ставіць п'есу будзе рэжысэр гэтага-ж тэатру т. Вінэр пры асыстэнцы Сьмянава.

Рыхтуецца да пастаноўкі п'еса Грамыкі „Віно бушуе" з жыцьця сучаснага беларускага студэнцтва.

У сьнежні мае быць пастаўлена п'еса Гальдоні—„Бабскія плёткі". На пастаноўку гэтае клясычнае п'есы запрошан вядомы рэжысэр Пятроўскі.

Уключаны ў рэпэртуар наступнага тэатральнага сэзону п'еса Дзяржавіна «Шлак» і п'еса артыста БДТІ Зорава „Сьвітаньне".

У хуткім часе прыяжджаюць на сталую працу ў БДТІ два вядомыя салісты балету—Сямёнаў і Брэві. Сямёнаў адначасова будзе і балетмайстрам. Яму будзе даручана пастаноўка новага балетнага вечару.

Галоўным рэжысэрам, зразумела, застаецца заслужаны артыст т. Міровіч, які кіруе сталай працай рэжысуры, афармленьнем сваёй п'есы, пастаноўкай п'есы „Шлак" і інш. Дырыжэрам аркестру застаецца Макс Купэр.

У арыентыровачны плян уключана п'еса т. Міцкевіча «Мушка-зелянушка», як жартлівая дзіцячая пастаноўка.

Дзеля падрыхтаваньня сваіх рэжысэраў пры БДТІ з'арганізаваны лябараторны гурток пад сталым кіраўніцтвам т. Сьмянава.

У гурток запісалася 7 асоб.

БДТІ увесь сэзон будзе працаваць у Менску, прычым спэктаклі будзе ставіць штодня.

Да 10-цігодзьдзя аглашэньня БССР БДТІ рыхтуе п'есу „Сьвітаньне". Гэта п'еса малюе рэвалюцыйнае абуджэньне беларускага народу.

Новы беларускі тэатральны калектыў.

У Менску зараз разьвівае сваю працу новы беларускі тэатральны калектыў—«Наш Тэатр». Калектыў гэты з'арганізаваўся в драматычнага гуртка Менскіх бухгальтарскіх курсаў.

Для працы з гэтым калектывам упярод былі запрошаны артысты БДТІІ. Саньнікаў і Малчанаў, які паставіў п'есу—«Пашыліся ў дурні», т. Стальмах распрацаваў для калектыву інсцэніроўку «Босыя на вогнішчы» М. Чарота, што складае фактычна калектыўную дакламацыю в інсцэніроўкай у рухах поўных месц. Апроч гэтага, Стальмах паставіў п'есу „Гірд в воўчага логу" (латыскага пісьменьніка Райніса).

Зараз на працу ў калектыў запрошаны артысты БДТІ т. т. Жданові і Ільінскі. Першаму даручана пастаноўка п'есы «На стыку» Цішкі Гартнага, другому—п'есы Гурскага „Будні". У бліжэйшыя часы калектыў рыхтуе п'есу Бірукова «Лекерт в гэто», у перакладзе Красінскага, «Шляхамі розными».—Стальмаха—з жыцьця сучаснай беларускай вясковай моладзі, «Танная забава» Галіята—з жыцьця кітайскага пралетарыяту і інш.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАПЭЛЯ.

Два гады таму назад на ініцыятыве Інбелкульту ў г. Менску быў арганізован «Студыйны беларускі хор». Арганізацыяй памянёнага хору Інбелкульт прасьледаваў ідэю адбіць быт нашага беларускага сялянства ў мастацкім выкананьні студ. хорам нацыянальных, рэвалюцыйных і бытавых песьняў.

Цяжкія былі першыя крокі ў арганізацыі хору. Ня мала прышлося патраціць энэргіі, каб сабраць песьні, адбіваючыя быт нашага сялянства, бо апошнімі, г. зн. песьнямі, наша Беларусь не багата, а матывы, якія маюцца, пераважна маюць сумны характар; у іх чуецца гора і сьлёзы селяніна, які знаходзіўся доўгі час у кабале абшарнікаў.

Рэвалюцыя абудзіла забітага беларускага селяніна, дала яму волю, і вось в гэтага часу ў песьнях беларуса пачынаюць вяўляцца і радасныя матывы.

Цяжкія матар'яльныя акалічнасьці, якія прышлося перажыць хору, адсутнасьць адпаведнага памяшканьня для заняткаў і цэлы шэраг іншых акалічнасьцяй некаторы час ставілі пачатую справу пад пагрозу вырву.

З часам рэпэртуар песьняў папаўняўся новымі, бо насустрэч хору прышлі нашы беларускія кампазытары—Аладаў, Шнытман, Анцаў і інш., якія пісалі песьні, бяручы сюжэт в тых жа беларускіх напеваў.

Пасьля першага году працы студыйны хор рызыкнуў падрыхтаваць канцэрт, прысьвечаны сьвяткаваньню „Гадавіны Бэтговэна", і, па маючыхся рэцэнзіях і водгуках, «9 сімфонія» прайшла в вялікім посьпехам,ня гледзячы на незвычайна цяжкую кампазицыю і на кароткі тэрмін падрыхтоўкі. Гэтым канцэртным выступленьнем «Студыйны хор», так сказаць, «перайшоў рубікон». Пачалі ўзмоцнена рыхтавацца да пастаноўкі оперы «Русалка». Які посьпех мела два разы гэта опэра ў дзяржтэатры—гаворыць друк і водгукі аб хоры. Выступленьні-ж хору на вэзьдах яшчэ больш умацавала яго папулярнасьць сярод мас г. Менску. Шэраг дасканалых канцэртаў у клюбах паказаў, што хор дасканала справіўся в ускладзенымі на яго Інбелкультам і ГПА задачамі, што і было адзначана Наркамасьветаю, які ўкамандураваў студыйны хор у Маскву (у лістападзе 1927 г.) для ўдзелу на „Мастацкай выстаўцы народнасьцяй СССР". У Маскве студыйны хор прабыў каля 2 тыдняў і за гэты перыяд каў цэлы шэраг канцэртаў на заводах і фабрыках Масквы. Атрыманыя водгукі і граматы на імя СНК Беларусі і Наркамасьветы ад імя Маскоўскае Акадэміі Мастацкіх Навук, а таксама атэстаты, якія яскрава падкрэсьліваюць дасягненьні нацыянальнае культуры Беларусі, адбітай у мастацкім выкананьні нац. песьняў студыйным хорам.

Такім чынам, усё гэта гаворыць аб тым, што Капэля ў поўнай меры выканала свае задачы, што яна пажадана і ў далейшым. Неабходна забясьпечыць матар'яльна ўдзельнікаў Капэлі, а таксама надаць ёй некаторыя ільготы і па прафесыянальнай лініі, як дзяржаўнай арганізацыі.

За два гады працы Капэля дала 134 канцэрты, в якіх—47 канцэртаў платных і 94 дармовых.

Д. Грацыянаў.

„БЫЎШЫМ ЛЮДЗЯМ" ДАЛІ ПА ШАПЦЫ.

У № 123 нашай газэты (за 30 мая г. г.) быў вымешчан артыкул пад загалоўкам—„Стара-Барысаўскі гнойнік". У гэтым артыкуле пісалася аб недапусьцімай безгаспадарчасьці і непарадках у с.-г. тэхнікуме.

На днях гэта справа разглядалася ў Менскай АКК-РСІ, якая адзначыла, што ў тэхнікуме ў працягу 2-х гадоў была вялікая безгаспадарчасьць і, наогул, непарадкі.

Дырэктар тэхнікуму згрупаваў вакол сябе людзей з былых абшарнікаў і паліцэйскіх.

Менская АКК-РСІ пастанавіла зьняць з працы дырэктара тэхнікуму Такмачова. Апрача гэтага, АКК-РСІ прыняла да ведама тое, што бухгальтар Нікіфаровіч, інструктар Карпіша і ст. рабочы Мельнікаў—ужо зьняты з працы (як «былыя людзі").

Загадчыку гасп. часткай Каўзановічу абвешчана вымова, а загадчыку фермай Замойскаму паставлена на від.

Пракуратуры запрапанована паскорыць разгляд справы аб тэхнікуме.

ХРОНІКА.

Да пабудовы ўрадавага дому ў Менску.

Нар. Кам. Унутраных спраў мае ў бліжэйшым часе прадставіць у Савнарком БССР пляны пабудовы ўрадавага дому ў Менску.

Усяго вызначана для выбару 5 вучасткаў: першы вучастак—на рагу вуліц Карла Маркса і Энгельса, другі—на Чырвонаармейскай вуліцы, супроць сквэру, дзе знаходзіцца музэй, трэці—па Савецкай, чацьверты—таксама па Савецкай, побач з трэцім вучасткам у бок Аляксандраўскага вакзалу і пяты—на месцы сквэру і рынку каля Заходняга вакзалу.

Усе Наркаматы ўжо прадставілі даныя аб патрэбнай ім плошчы.

Таксама ўжо выпрацавана праграма Усесаюзнага конкурсу на пабудову, гэтага будынку, якая будзе абвешчана пасьля зацьверджаньня Савнарыомам.

Усяго для пабудовы ўрадавага дому патрабуецца 18000 кв. мэтраў унутранай плошчы.

У Народным Камісарыяце РСІ.

13 інструктароў па машынізацыі і мэліярацыі.

Калегія НК РСІ для абслугоўваньня машынных і мэліярацыйных т-ваў пастанавіла ўтварыць 13 акруговых інструктароў. Гэта мерапрыёмства дасьць магчымасьць шырэй разгарнуць працу па машынізацыі с-г. і палепшаньню мэліярацыі.

За невыкананьне пастановы суду.

НК РСІ паставіў на від Мазырскаму Акрфа за невыкананьне пастановы Мазырскага нарсуду па справе ЦРК, а таксама пастаўлена на від НКГ Спраў за фармальныя адносіны да гэтай справы.

На карысьць бяспрытульных.

Адказныя працаўнікі і калектыў служачых ЦВК і СНК БССР уносяць на карысьць бяспрытульных дзяцей 55 р. 50 кап. і выклікаюць усе калектывы савецкіх і грамадзкіх устаноў і арганізацыі БССР.

Вынікі „Тыдню абароны" па Менскай акрузе.

11-га жніўня ў садзе Працасьветы адбыўся вечар, прысьвечаны вынікам правядзеньня «Тыдню абароны» на Менскай акрузе, які быў наладжаны Менскім акрсаветам ТДА-Авіяхіму.

Усяго за час „Тыдню абароны" было праведзена на агульных сходах ячэек каля 63 дакладаў, па Менску абсьледавана 50 ячэек.

Вечар у садзе «Прафінтэрн» даў каля 5000 руб., а ўсяго за «тыдзень абароны» сабрана каля 9000 руб.

Апрача таго, у час „Тыдню абароны" адбыліся 10 выхадаў у поле. Праз газавабкурваньне прайшло каля 2500 чал.

На гэтым-жа вечары прэзыдыум Менскага акрсавету ТДА-Авіяхіму ўзнагародзіў ганаровымі граматамі ячэйкі ТДА-Авіяхіму Беларускай Аб'яднанай Вайсковай Школы, ДПУ, а таксама цэлы шэраг сяброў іншых ячэек ТДА-Авіяхіму за актыўную іх працу.

Вечар сабраў вялікую колькасьць працоўных і паказаў, што з боку апошніх маецца вялікая зацікаўленасьць да працы ТДА-Авіяхіму.

Вуліца Максіма Горкага.

Менскі гарсавет пастанавіў пераймеаваць 2-ю Сяргеєўскую вуліцу ў вуліцу Максіма Горкага.

Апроч гэтага, перайменаваны цэлы шэраг безназоўных завулкаў.

Зварот студэнтаў БДУ з лягераў.

13 жніўня вывярнуліся з лягераў студэнты Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. У лягерах студэнты знаходзіліся два в паловай месяцы. У Менску на вакзале ім было наладжана ўрачыстае спатканьне.

Перавозка заразных хворых.

У Менску зараз будзе разьяжджаць спэцыяльная карэта для перавозкі заразных хворых. Усе заразныя хворыя будуць вымяшчацца ў 3-ю больніцу.

Рэканструкцыя харчовай прамысловасьці.

ЦК саюзу харчавікоў выказаўся за пабудову ў наступным годзе ў г. Менску кандытарскай фабрыкі, а ў Талачыне—мармаляднай.

Прымаючы пад увагу, што беларускія дражджавыя і крахмальныя заводы ня поўнасьцю нагружаны, ЦК выказаўся за частковы перавод гэтых прадпрыёмстваў на выраб макарону.

Экспарт сялянскага ткацтва заграніцу.

Управа Дзяржаўнага Гандлю вядзе падрыхтоўку да экспартаваньня заграніцу матар'ялаў розных саматужных вырабаў. У першую чаргу зварачваецца ўвага на вывяз розных прадметаў ткацтва.

Кіно-перасоўкі на вёсцы.

Зараз па савецкіх гаспадарках, лясьніцтвах і мястэчках працуюць 13 кіно-перасовак і 113 радыё-ўстановак саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых.

За час в 1 ліпеня 1927 г. да 1 ліпеня 1928 г. кіно-перасоўкамі прадэманстравана звыш 100 кіно-кардзін.

Барацьба з тубэркулёзам рагатай скаціны.

Наркамзем мяркуе правесьці ў наступным годзе дасьледваньне здароўя рагатай скаціны Менскай і Віцебскай округ. Дзеля гэтага кожнай карове будзе ўпырснуты тубэркулін, дзеля таго, каб выявіць захаваных формаў тубэркулёзу.

Менскі дзень.

З наступнага вучэбнага году ў Менску будзе адчынены інтэрнат для дзяцей беларускай, яўрэйскай і польскай нацыянальнасьцяў—вучняў, якія пражываюць на раёнах акругі.

50000 руб. на ўборку ўраджаю ў савецкіх гаспадарках БССР адпусьціў Белсельбанк.

За год дзіцячыя паноультацыі Менску наведала 49520 дзяцей.

10957 руб. разьмеркаваў Менскі акрвыканком па райёнах на мерапрыёмствы супроцьпажарнай барацьбы.

720 руб. пастанавіла адпусьціць ЦП саюзу сельгаслесарабочых на працягу 4 гадоў вучобы, штомесячна па 15 р., сям'і батрака Казачонка, які камандыраван ЦК саюзу ў унівэрсытэт імя Сьвярдлова.

Дзіцячы сад для бяднейшых саматужнікаў адчыніце Беларускі Саматужна-Прамысловы саюз. У гэты сад будзе прынята каля 40 дзяцей.

35 бронь-вучняў трэсьціраваных савгасаў будзе сёлета прынята ў Жыліцкую школу сельска-гаспадарчага вучнёўства. У школу прымаюцца асобы ад 14 да 16 гадоў уключна в адукацыяй у аб'ёме 4 годзі.

У калегіі Нар. Кам. Асьветы зараз абгаварваецца пытаньне аб адчыненчні яўрэйскага аддзяленьня на вячэрнім рабфаку.

Усебеларускую канфэрэнцыю опэцыялістаў пастанавіла склікаць ЦП саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых на 9-га сьнежня.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА.

Вэтэрынарнае абслугоўваньне калгасаў.

Наркамзем узьняў пытаньне аб сталым і сыстэматычным вэтэрынарным абслугоўваньні калгасаў БССР. У сувязі з гэтым наладжваецца кантакт в калгасным цэнтрам пры Белсельсаюзе.

Барацьба з пошасьцю сапу.

У наступным годзе Наркамзем пастанавіў правесьці ў Бабруйскай акрузе вывучэньне пошасьці сапу сярод коняў. Дзеля гэтага будзе праведзен вэтэрынарны агляд усіх коняў.

Суд.

ХАЛАПЕНІЦКІЯ КАНТРАБАНДЫСТЫ.

У 1924 годзе, калі прыватны гандаль дажываў апошнія хвілины, буйныя гандляры м. Красналук Ліўшыц і Ротшыльд прымушаны былі зачыніць свой гандаль; але, маючы значныя сродкі, рашылі заняцца новай камэрцыяй.

Пазнаёміўшыся з кулакамі Антосем Сталярчуком і Сяргеем Глушцовым і склаўшы ў хаўрусе значны капітал, гэта цёплая кампанія, в мэтай нажывы, арганізавала кантрабандыстскі блёк у ліку 13 асоб.

Каб лепей разгарнуць працу, рэгулярна і бесперабойна дастаўляць кантрабандны тавар з Польшчы на абшары БССР, блёк, распрацаваўшы плян дзейнасьці, разьмеркаваў абавязкі наступным парадкам: Глушцоў, Сталярчук, Ліўшыц і Ротшыльд—кіравалі кантрабандыстамі і дастаўлялі грошы; Цімафей Ярош, Архрм Мацкевіч і Пеўль Гардзюшка—былі пераводчыкамі праз дзяржаўную мяжу і закупчыкамі кантрабанды ў Польшчы; Іван Каўбасовіч, Базыль Аўтушка, Агафон Аўтушка і Пракоп Марковіч—былі сталымі посчыкамі і таварэй з Польшчы ў БССР, а Пятрусь Маліноўскі, Маланьня Булай і Якуб Прыстаўка—былі прызначаны агентамі па распаўсюджваньні тавараў сярод прыватных гандляроў і, наогул, на збыту кантрабанды з надбаўкамі на тавар, якую накладалі верхаводы шайкі Глушцоў і Сталярчук.

Па размеркаваньні абавязкаў сярод кантрабандыстаў Глушцоў, Сталярчук, Ліўшыц і Ротшыльд адпусьцілі Ярошу, Мацкевічу і Гардзюшку, як важатым і закупшчыкам, авансы грошай, якія разам з сталымі посчыкамі накіроўваліся па начах праз дзяржаўную мяжу ў Польшчу, дзе закупілі тавар замежнага вырабу—коцікавыя скуры, сахарыны, панчохі, суконныя ткані і інш., дастаўлялі іх на тэрыторыю БССР, а Маліноўскі, Булай і Прыстаўка прадавалі тавары па павышаных расцэнках і выручку здавалі ў галоўную касу—Глушцову і Сталярчуку. Посчыкі і агенты па продажу тавараў працавалі за асабістую ўзнагароду і процанты.

Так кантрабандная шайка дзейнічала звыш двух год, але потым была выкрыта.

Справа разглядалася Менскім Акруговым Судом з удзелам пракурора і абароны. Суд прытвердзіў: Антося Сталярчука і Сяргея Глушцова—на пяць год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем у правох на тры гады кожнага і канфіскацыяй на 1 карове; Яроша Цімоха, Гардзюшку Пеўла і Мацкевіча Архрма—на тры гады зьняволеньня з пазбаўленьнем у правох на 1 год кожнага; Маліноўскага Пятруся—на два гады зьняволеньня з пазбаўленьнем у правох на 1 год і канфіскацыяй 1 каровы; Каўбасовіча Івана, Аўтушка Архрма, Аўтушка Васіля, Марковіча Пракопа, Булай Маланьню і Прыстаўка Якуба—на 1 год зьняволеньня—усіх з суровым адмежаваньнем.

Дастасаваўшы амністыю ў адзнаку 10-й гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі, мера сацыяльнай абароны Пятрусю Маліноўскаму скарочана напалову, а Каўбасовіч, Аўтушкі Архрм і Базыль, Марковіч, Булай і Прыстаўка ад трыманьня пад вартай вызвалены.

Справа адносна Ліўшыца і Ротшыльда прыпынена—за іх адсутнасьцю.

Кастроў.

Ліст у рэдакцыю.

У газэце Савецкая Беларусь" ад 6-VII 1928 г. вымешчан артыкул «Як менскі інспэктарыят асьветы распарадзіўся фондам беднаты».

Аўтар артыкулу абвінавачвае інспэктарыят народнае асьветы і ў прыватнасьці мяне ў тым, што інспэктарыят: 1) не падлічыў магчымасьцяй свайго бюджэту і выдаў Белдзяржвыдавецтву вэксалёў на куды большую суму, чым сёлета асыгнавана на вучэбную частку для вясковых пачатковых школ, 2) фонд беднаты інспэктарыятам быў патрачан не па прызначэньні.

Па сутнасьці артыкул у корані няверна высьвятляе справу.

Пацершае, Менскім АВК па хадайніцтву інспэктарыяту выдадзена БДВ вэксалёў для закупкі падручнікаў на 25 тыс. руб., пры расфармаваньні Барысаўскай і Слуцкай акруг акрвыканком атрымаў яшчэ вэксалёў на 43850 руб. усяго такім чынам склаўся іх на 68850 руб.

Пры зацьверджаньні каштарысу па § 4 арт. 3 (навучальн. прылады і дапамога беднаце) было праведзена 74010 р., належала атрымаць па сустрэчных вэксалёх ад Полацку і Воршы на гэтую мяту 8500 р., а ўсяго ў каштрыс было ўнесена 82510 р. З гэтых разьлікаў відаць, што абвінавачаць Інспэктарыят у тым, што ён выдаў вэксалёў «на куды большую суму чым сёлета асыгнавана на вучэбную частку» на меншай меры няма ніякае падставы.

Падругое—дзе дзеўся фонд беднаты? У пачатку навучальн. году было выдадзена на 3100 р. райёнам сшыткаў выключна для бяднейшых вучняў, меркавалася, што сшыткі аплоцяцца часткова за кошт фонду беднаты, вопыт месцаў паказаў, што бяднейшыя вучні бяз сшыткаў пішуць на абрыўках паперы, адстаюць, часам з-за гэтага застаюцца на другі год, ці кідаюць школу.

Меркавалася таксама патраціць 1000 р. на бяднейшых вучняў г. Менску і 200 р. на тую-ж мэту ў г. Барысаве, а рэшту разьмеркаваць на райёнах.

1000 р. скарыстана для бяднейшых вучняў г. Менску, 200 руб. на тую-ж самую мэту ў г. Барысаве, 3100 р. патрачана на аплату сшыткаў вытворчым майстрам. 6197 руб. масьца вольнага крэдыту (з якіх 4000 руб. належыць в Полацкага АВК).

Па тлумачэньнях Інспэкцыі Нарасьветы астача фонду не магла быць скарыстана ў вязку з тым, што ён атрыман позна. Да рэчы пратакол СНК аб зацьверджаньні каштарысу і водпуску фонду для беднаты атрыман у АВК 11-ІІ, у акрфа—13-ІІ, а я в 16-ІІ знаходжуся на другой пасадзе.

Ніякага пералічэньня з фонду беднаты на іншыя патрэбы ня было ў зьвязку з скарачэньнем каштарысу.

Такім чынам, частка фонду дапамогі беднаце скарыстана па прызначэньні, а частка не скарыстана. У заметкі «Выстрэл и натиск» у № 156 даводзіцца, што рамонт у калёвіі Сёмкаў Гарадок праводзіўся безгаспадарча, без папярэдняга каштарысу, нібы-та камандыроўкі каштавазі дагравата і г. д.

На самай справе рамонт праводзіўся па папярэдняму каштарысу і ў хуткім парадку, бо было заданьне СНК скончыць яго у працягу 2 месяцаў. Расьпляніроўка памяшканьня была ўгоджана з Прэзыдыумам Акруговага Выканаўчага Камітэту. У працягу рамонту туды наяжджаў гарадзкі архітэктар, акты якога сьведчаць, што рамонт праводзіўся нармальна.

У часе прыёму будынку ў чэрвені 1928 году праз некалькі месяцаў пасьля яго скончэньня заўважаны недахопы па рамонту, але яны ня могуць быць аднесены да сур'ёзных дэфектаў рамонту, бо памяшканьне галоўнага корпусу рамантавалася нянёўнасьцю і з тае прычыны, што памяшканьне старое, дык яму патрабаваўся больш грунтоўны рамонт, а разам з гэтым і большая затрата сродкаў, пагэтаму ўсе прыведзеныя дэфекты вынікаюцца пасьля такога тэрміну мажлівымі.

«Праведзены астатні грунтоўны рамонт ня мае сур'ёзных дэфектаў, акрамя азначаных вокнаў і дзьвярэй (8 вокнаў і 6 дзьвярэй), якія маглі-б патрабаваць значных выдаткаў у далейшы час». (З акту на прыёму камісіяй рамонту).

Такім чынам, усе недахопы, заўважаныя камісіяй, патрэбна адвесьці да амартызацыі, а не да безгаспадарчасьці.

Нарэшце адна заўвага: камандыраванных за паездкі ў Сёмкаў Гарадок я не атрымліваў ні аднае капейкі.

Раней ня мог даць тлумачэньняў па сутнасьці заметак, бо быў у камандыроўцы.

Б. акруговы інспэктар Нар. Асьветы Менскае акругі Г. БРЫГНЕВІЧ.

АД РЭДАКЦЫІ: Артыкулы—«Як Менскі інспэктарыят Асьветы распарадзіўся фондам беднаты» і „Быстрота и натиск"—былі напісаны на падставе інфармацыі адпаведных устаноў, дадзеных супрацоўніку рэдакцыі.

Паштовая скрынка.

Т. т. В. Мішур, Наруцкаму Янку, Аранкову Ісаку, Н. Афанасьеву, Фінкелю Ш., Сролікаву П., Шоўкавічу Сяргею, Дзергачову Міхасю.

Вы запрошаны карэспандэнтамі нашай газэты. Шліце дописы. Асобным заданьні будуць даданы у асабістых лістох.

Іваановічу Андрэю. Абяржэньне на заметку, вымешч. у «С. Б.» № 142 «Сельскараўскі рух узмацняецца», накіравана ў Самахвалавіцкі райком КП(б)Б на расьсьледаваньне. Аб выніках паведамім.

К. Р. „На пятым годзе беларусізацыі"—ня пойдзе.

Гаспадарчыкі і рамонты.

Надаўна праз камэру яўрэйскага Нарсуду ў Менску прайшло цэлы шэраг менскіх гаспадарчыкаў-дамаўласьнікаў, якія, ня гледзячы на катэгарычную пастанову прабіць у іх дамох капітальны рамонты, вінкага рамонту не зрабілі. У той-жа час яны вельмі спраўна бралі кватэрную плату, але мала клапаніліся, каб кватэранты ў сваю чаргу мелі адрамантаванае памяшканьне.

Дамаўласьнік Блехер спрабуе апраўдацца тым, што рамонт ён хацеў зрабіць, але не знайшоў неабходных матар'ялаў для рамонту.

Праўду кажучы, матар'ялы можна дастаць, калі толькі ёсьць жаданьне зрабіць рамонт.

Яўрэйскі суд у Менску пастанавіў абвесьціць дамы Блехера і Богіва, як бесгаспадарчыя.

Пасьля таго, як гэта пастанова будзе пацьверджана вышэйшымі інстанцыямі, вадумоцца, паўна, і іншыя дамаўласьнікі.

С. Э.

Апавяшчэньні.

— Сёньня 15-га жніўня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні ГРК КП(б)Б скліканая нарада шэфаў, якія шэфствуюць над Заслаўскім райёнам, сумесна з прадстаўніком падшэфнага райёну, па пытаньні аб бліжэйшай працы шэфаў.

На нараду абавязкова павінны зьявіцца ўсе сябры наступных выканбюро: Харчэўнікаў, Польпедтэхнікуму, Лесбелу, 2-й і 3-й Савбольніцы, ЦВК, Нархарч, Наркамаграды, Акрфа і завод «Уход».

Гаррайкрайўпраўленьне шэфтаварыства.

— Навучальная Частка Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі с-г. даводзіць да ведамы ўсіх паступаючых у Акадэмію ў гэтым годзе, што першыя выпыты на прыёму будуць вытварацца з 16-9 г. г.

Заняткі на першых курсах пачнуцца з 1-га верасьня. Другі сэсіён будзе ўтвараца з 1-га па 15-е верасьня.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, 15 жніўня кіно „Каханьне у 16 год" (зам. бавэін).

Пачатак 1-га сэсэну ў 8 з пал. гадз 2-га а 10 гадз. увеч.

Білеты 10-15 к.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 15-VIII 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—66 куп. 4—64.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—18,5 куп. 5—16,5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—03, куп. 5—01.

Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 26,09, куп. 25—99.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 122,50, куп. 120,50.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР-ЦЫРК-КІНО.

МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Маскоўская мастацкая опэра пад кір. Г. М. КАМІСАРЖЭЎСКАГА
У сераду, 15-га жніўня.
„ЦАРСКАЯ НЕВЕСТА"
Опэра ў 4-х дзеях. Музыка РЫМСКАГА-КАРСАКАВА
Удзельнічаюць: Сямізорава, Хорына, Тройцын, Бангард, Чарышоў, Паўлоўскі, Осіпаў, Сакалоўскі, Карэнін.
Дырэктар А. Л. КЛІБСОН.

У сераду 15 жніўня ЦЫРК У сераду 15 жніўня
АДЧЫНЕНЬНЕ СЭЗОНУ.
15 нумароў лепшых расейскіх і замежных артыстаў цыркавога мастацтва,
Канюшня пад кіраўн. вядом. муштроўшчыка ВІЛЬСОНА.
Пачатак роўна а 8 з палов. гадз. веч.
Білеты ў касе цырку ад 11 да 3 і ад 5 да 9 гадз. веч.
Упаўнаважаны ПАУЛ.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».
З аўторка 14 жніўня
КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ.
Пачатак а 7 гадзіне.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ.
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
„ЗАЛАТОЕ РУНО"
Звыш праграмы—гастролі гумарыста-сатырыка А. Шацкага.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
Ад аўторка, 14 жніўня,
БЭСТЭР КЭЙТОН у лепшай камэдыі сэзону
„АПАНТАНЫ" (як зрабіцца выведнікам)
У 6 частках.
Звыш праграмы—хроніка Белдзяржкіно.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».
2-я перадапошняя сэрыя 2-я
„САРВІ-ГАЛАВА".
Кіно-раман у 8 частках.

ЖАДАЮЧЫЯ ПАСТУПІЦЬ
У ТЭХНІЧНУЮ АВІЯЦЫЙНУЮ ШКОЛУ
павінны зьявіцца у Менакрсавет ТДА-Авіяхіму (вул. Энгельса, 26) 15 і 16 жніўня г. г. в 12 да 6 гадз. вечара в дакумантамі аб адукацыі, аб нараджэньні і сацыяльным становішчы.
ПРЭЗЫДЫУМ МЕНАКРСАВЕТУ ТДА-АВІЯХІМУ.

ДА 25-ЦІГОДЗЬДЗЯ II-га ЗЬЕЗДУ ПАРТЫІ.
„ВЫВУЧАЙЦЕ ГІСТОРЫЮ УсеКП(б)".
КОЖНЫ ПАРТЫЕЦ, КАМСАМОЛЕЦ, ПЕРАДАВІК РАБОЧЫ, СЕЛЯНІН, СЛУЖАЧЫ, ІНТЭЛІГЕНТ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ І ВЫВУЧАЦЬ ГАЛОЎНЫЯ МОМАНТЫ Ў ГІСТОРЫІ УсеКП(б)—ПЭРЫЯД „ІСКРЫ", РОЛЯ У. І. ЛЕНІНА Ў СПРАВЕ СКЛАДАНЬНЯ ПАРТЫІ, БАРАЦЬБА З ДРОБНАБУРЖУАЗНЫМІ ПАРТЫЯМІ (МЕНШАВІКІ, ЭС-ЭРЫ) І ПЛЫНЯМІ ЎНУТРЫ УсеКП(б) (ТРАЦКІЗМ І ІНШ.), ВА ЎПАРТЫХ СУТЫЧКАХ З ЯКІМІ ВЫРАС І ЎЗМАЦНЕЎ БАЛЬШАВІЗМ.
СЬПІС КНІГ,
якія рэкамэндуюцца Агітпропам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б
НАВІНКА! НАВІНКА!
1) ЛЕПЯШЫНСКІ.—Ля вытокаў бальшавізму, на беларускай мове. Ц. 15 к.
2). АГУРСКИЙ.—Революционное движение в Белоруссии (1863--1917 г.), на рус. языке. Цана 3 руб.
3) ПАПОЎ.—Нарысы гісторыі УсеКП(б), на беларускай і расейскай мовах. Цана 1 р. 40 к. і 1 р. 25 к.
4) АГУРСКИЙ.—Еврейский рабочий в коммунистическом движении (1917--1921 г. г.), на рус. и евр. языках. Цана 1 р. 20 к.
5) АГУРСКІ—1905 год у Беларусі. На беларускай, расейскай і яўрэйскай мовах. Цана 70 кап.
6) Жандармское дело 1905 г. в Белоруссии. На русском языке. Цана 2 руб.
7) КЕРЖАНЦАЎ К.—Да гісторыі РКП(б), на беларускай мове. Ц. 60 к.
Усе пералічаныя кнігі маюцца ў г. Менску ў Цэнтральнай кнігарні Белдзяржвыдавецтва, рог Ленскай і Савецкай вул. і магазынах акруговых і райённых аддзяленьняў БДВ.
На працягу жніўня м-ца Белдзяржвыдавецтвам на ўсе выданьні да 25-цігодзьдзя зьезду партыі прадастаўляецца 25 проц. скідкі.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

4-ты ТЫРАЖ
выйгрышаў Дзяржаўнай унутранай 6% выйгрышнай
ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ
будзе праводзіцца 20, 21 і 22-га жніўня 1928 г. у гор. СТАЛІНЕ (Дакбас).
У гэтым тыражы будзе разыграна 23.300 выйгрышаў на суму 3.001.500 руб., у тым ліку: 1 выйгрыш у 25.000 руб., 5 выйгрышаў па 10.000 руб., 10 выйгрышаў па 5.000 руб., 84 выйгрышы па 1.000 руб., 3.150 выйгрышаў па 250 руб. і 20.050 выйгрышаў па 100 рублёў.
ВАЛЮТНАЯ ЎПРАВА НКФ БССР.

Гальцаўскі ЗАГС выкліча на 25 жніўня гр-на в. Уладыкі, Гальцаўскага с.-с. Каханоўскага р-ву, Аршанскай акругі АБЛАВАЦКАГА, МІКОЛУ ЛЯКСЕЕВАГА, па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай АБЛАВАЦКАЙ, ПЕЛАГЕЯЙ КУЗЬМОВАЙ.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Сабр. білет № 27484 Галубіцкага' выд. Слабадзкім РК саюзу сельгаслесарабочых, кв. 1013.

— Патэнт № 91 Багушэўскага Б., кв. 1014.

— Патэнт № 92 Шляштох І., кв. 1015.

— Асабован кніжка Шабасова П. Д. выд. Крупскім РВК, кв. 996.

— Партбілет № 1103854 Плоткіна Р. М., кв. 997.

ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ
І-га і ІІ-га КАНЦЭНТРУ, ДАШКОЛЬНЫХ УСТАНОЎ, ШКОЛ МАЛАПІСЬМЕННЫХ І ЛІКПУНКТАЎ
БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦВА
ВЫПУСКАЕ ГЭТЫМІ ДНЯМІ
наступныя мэтадычныя дапаможнікі:
І. Для настаўнікаў І канцэнтру.
1. Выпуск першы—СЬЦЕПАНОВІЧ.—«Родная мова ў комплексной сыстэме выкладаньня ў школе І канцэнтру».
2. Выпуск другі—САГАЛОВІЧ і ПІСАРЧЫК. — „Матэматыка